Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі

Год выданьня—XV
№ 108 (4012)
ПАНЯДЗЕЛАК, 20 КРАСАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬМЕРАПЫННА

Генэральная праверка працягваецца да 1 мая

УСІМ РАЁННЫМ ПРАВЕРКОМАМ

Генэральная праверка падрыхтоўкі да сяўбы працягваецца да 1 мая. Затрымайце працаўнікоў на мясцох і яшчэ больш напружанымі тэмпамі штурмуйце прарывы па завяршэньні падрыхтоўкі да сяўбы.

Цэнтральны штаб генэральнай праверкі.

19-ы ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

30 проц. бядняцка-серадняцкіх двароў БССР

будуць калектыўна праводзіць сяўбу

ПАКІДАЮЧЫ ў КАЛГАСАХ КУЛАКОЎ і ВЫЧЫШЧАЮЧЫ БЕДНЯКОЎ і СЕРАДНЯКОЎ, „ЛЕВЫЯ" загібшчыкі ЧАШНІЦКАГА раёну ВЫКОНВАЮЦЬ ЗАКАЗ КУЛАКА

Посьпех другой калгаснай вясны рашае сапраўды бальшавіцкая барацьба з кулаком і яго агентамі—„левымі" і правымі апартуністамі

Менск, 20 красавіка

Сёньня дзевятнаццаты дзень генэральнай праверкі. Мы яшчэ ня маем зводак аб праведзенай рабоце за другую дэкаду праверкі. Апошнія матар'ялы з раду раёнаў, якія ў «Зьвязьдзе» друкаваліся за апошнія некалькі дзён, сьведчаць, што падрыхтоўка да сяўбы далёка ня ўсюды завершана. 19 дзён генэральнай праверкі, бясспрэчна, зрабілі вялізарны ўплыў на ўзмацненьне тэмпаў работы па калектывізацыі, кантрактацыі і ажыцьцяўленьні важнейшых агра-вытворчых мерапрыемстваў. Аднак, у радзе месц ня ўсе прарывы пікідаваны, далёка ня ўсё ўжо зроблена, каб сапраўды спаткаць вясну ва ўсеўзбраеньні.

«Змаганьне партыі за сапраўды бальшавіцкія тэмпы калектывізацыі, — гаворыцца ў пастанове красавіцкага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, — выкананьне загатовак, падрыхтоўка да веснавой сяўбы і кантрактацыя выклікае асаблівае жорсткае супраціўленьне кулацтва і значна абвастрыла клясавую барацьбу на вёсцы. Між тым, рад раёнаў не вядзе сыстаматычнай і ўпартай барацьбы з кулаком і яго агентурай, або зусім не знаходзіць кулака. Некаторыя раёны аказаліся няздольнымі выкрыць маньёўры кулака, мабілізаваць масы для таго, каб зламаць яго супраціўленьне і забясьпечыць баявыя тэмпы калектывізацыі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы». Правільнасьць гэтага ярка пацьвярджаецца шматлікімі матар'яламі праверачных камісій і брыгад на канкрэтных фактах і прыкладах. Кулак пры патураньні, а часта пры непасрэднай дапамозе правых апартуністаў і «левых» загібшчыкаў, імкнецца сарваць разгорнутае сацыялістычнае наступленьне. У сувязі з набліжэньнем веснавой сяўбы, у сувязі з ростам руху мас беднякоў і сераднякоў за калгас, кулак актывізаваў сваю шкодніцкую дзейнасьць, не пагарджаючы ніякімі сродкамі, высоўваючы ўсё новыя і новыя мэтады барацьбы.

Характэрнай у гэтых адносінах зьяўляецца карэспандэнцыя з Клімавіч, якую мы сёньня зьмяшчаем, дзе аказваецца, што апартуністычнае кіраўніцтва аднаго з сельсаветаў, якое страціла клясавую пільнасьць, забыла аб кулаку. Пад носам у партыйнай ячэйкі і сельсавету, пры патуранні некаторых раённых работнікаў, клясавы вораг рабіў сваю справу, тут фактычна кіраваў... калектывізацыяй. Імкненьні кулака былі накіраваны да таго, каб адарваць масы серадняцтва ад беднаты і батракоў. Іменна з гэтай мэтай кулак арганізаваў у вёсцы, дзе ёсьць моцны батрацка-бядняцкі калгас, яшчэ два самастойныя калгасы. Гэта было зроблена спэцыяльна для таго, каб у новых двух калгасах укрыць «цьвёрдазаданьнікаў», каб, уцягнуўшы сюды сераднякоў, адарваць серадняцтва ад беднаты. Гэтыя кулацка-заможніцкія калгасы павінны былі стаць апорнымі пунктамі барацьбы з калектывізацыяй, з батрацка-бядняцкім калектывам, які знаходзіцца побач.

Такі яўна шкодніцкі маньёў клясавага ворага застаўся незаўважаным партыйнай ячэйкай і сельсаветам, якімі кіравалі махровыя правыя апартуністы. Не на вышыні становішча аказаліся і раённыя арганізацыі, якія да гэтага часу яшчэ не зрабілі рашучых высноў з данай справы, не завастрылі ўвагі партарганізацыі і мас на гэтым новым мэтадзе барацьбы кулака.

Паданыя факты сьведчаць аб усё яшчэ зусім невыстарчальным адпоры клясаваму ворагу, аб яўна невыстарчальнай мабілізацыі мас на барацьбу з кулаком у радзе раёнаў. Барацьба з клясавым ворагам у некаторых мясцох вядзецца вельмі прымітыўна і абстрактна, быццам мэтады шкодніцкай работы клясавага ворага застаюцца ранейшымі. Між тым, кулак узбагаціў сваю тактыку такімі новымі спосабамі барацьбы, такімі новымі маньёўрамі, якія, з прычыны сваёй тонкасьці і хітрасьці, прадстаўляюць асаблівае вялікую небясьпеку. Яркім прыкладам могуць служыць такія, напрыклад, рэзультаты кулацкіх маньёўраў, як зьнішчэньне коняй, разбазарваньне насеньных і кармавых фондаў, зрыў кантрактацыі ў радзе сельсаветаў, ігнараваньне падрыхтоўкі да сяўбы аднаасобнікамі некаторых вёсак, супраціўленьне ўкараненьню ў калгасах зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх і г. д. Бясспрэчна, што рад прарываў у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы ў значнай ступені тлумачыцца шкодніцкай дзейнасьцю кулака, невыстарчальным адпорам клясаваму ворагу ў радзе раёнаў.

Генэральная праверка падрыхтоўкі да сяўбы працягнута да 1 мая. За гэтыя 10 дзён павінны быць пікідаваны ўсе прарывы ў ажыцьцяўленьні агра-вытворчых мерапрыемстваў да сяўбы, у арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельшчыны, яшчэ на большую вышыню павінна быць узьнята хваля калгаснага прыліву.

Усе партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны памятаць, што посьпех другой бальшавіцкай вясны вырашае сапраўды бальшавіцкая барацьба з кулаком, сапраўды бальшавіцкі адпор саюзьнікам клясавага ворага — правым і «левым» апартуністам.

Папраўка

У зьмешчаным № 98 «Зьвязды» артыкуле «У квасьце ўсіх рэспублік і абласьцей» адзначана было, што Юравіцкі раён ганебна адстае ў правядзеньні кантрактацыі, што пляны кантрактацыі ў гэтым раёне даведзены былі да калгасаў і сельсаветаў толькі 25-га сакавіка. З прадстаўленых Юравіцкім РВК даных відаць, што гэта няверна. РВК прадставіў весткі, што плян кантрактацыі быў даведзены да калгасаў і сельсаветаў яшчэ да 1-га сакавіка, а на 25 сакавіка ён быў выкананы на 49 проц.

Бюлетэнь № 18

«Зьвязда» пісала ўжо аб недаацэнцы цэнтральнымі і раённымі калгасна-зямельнымі арганізацыямі каня. Надзеі выключна на завоз трактараў і апартуністычнае ігнараваньне конскай цягавай сілы на даным этапе ствараюць рэальную пагрозу пасьпяховаму правядзеньню веснавой сяўбы.

Стварэньне ФУРАЖНЫХ ФОНДАЎ праходзіць недапушчальна марудна. Абагульненьне коняй, асабліва ў новаарганізаваных калгасах, апартуністы адкладваюць да пачатку палявых работ. У радзе месц коняй дрэнна дагледаюць.

Тэмп абагуленьня рабочай жывёлы адстае ад тэмпу калектывізацыі. Так, па БССР на 1 студзеня г. г. на адзін двор у калгасах прыпадала 0,78 каня, на 1 лютага — 0,74 каня, на 1 сакавіка — 0,68 каня і на 10 красавіка — 0,64 каня.

Гэтыя даныя паказваюць, што СЫГНАЛЫ «ЗЬВЯЗДЫ» НА МЯСЦОХ НЯ ЎЛІЧАНЫ. Мы маем ЗНІЖЭНЬНЕ забясьпечанасьці конскай цягавай сілай на адзін двор.

Гэтым апартуністычным адносінам да конскай цягавай сілы трэба даць РАШУЧЫ БОЙ. Зьніжэньне забясьпечанасьці коньмі калгасаў нельга інакш разглядаць як дапамогу клясаваму ворагу.

Раённыя арганізацыі і праверачныя камісіі павінны неадкладна мабілізаваць увагу грамадзкасьці вакол падрыхтоўкі каня да сяўбы. Дабіцца стварэньня фуражных фондаў. Неадкладна абагуліць коні, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў. Патрабаваць ад калгасьнікаў, якія перад уступленьнем разбазарылі коняй, каб апошнія купілі коняй і абагулілі, або здалі грашыма кошт каня ў калгас.

Генэральная праверка працягваецца да 1 мая. Гэтыя дні праверкі павінны даць рашучы пералом і ўздым забясьпечанасьці калгасаў конскай цягавай сілай. Па апартуністычных адносінах да конскай цягавай сілы трэба біць, як па правых кулацкай палітыкі.

НКЗБ прызнаў неабходным заводзкі выраб машыны Штэйнбэрга

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР

Накіраваная Наркамземам у саўгас Боркавічы да т. Штэйнбэрга спэцыяльная камісія для вывучэньня і спрабаваньня на працы машыны Штэйнбэрга для абчосваньня ільняных галовак, устанавіла:

а) машына Штэйнбэрга ў стане грубай, саматужнай, рабочай мадэлі па галоўных якасных паказальніках ня ўступае машыне Гільштэйна;

б) машына Штэйнбэрга дае больш прадукцыйнасьці ў адзінку часу, чым машына Гільштэйна і ёсьць магчымасьць далейшага значнага павялічэньня прадукцыйнасьці;

в) Калегія Народнага Камісарыяту Зямляробства пастанаўляе:

1. Лічыць неабходным заводзкі выраб машын Штэйнбэрга.

2. Адзначыць, што з боку Галоўленкому і б. Ільпаляныковага аб'яднаньня ня былі ўжыты меры для ажыцьцяўленьня вынаходства т. Штэйнбэрга і прапанаваць т. Кандраляю прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

3. Прасіць ВСНГ БССР у 3-хдзенны тэрмін вылучыць інжынэра-канструктара, які-б разам з т. Штэйнбэргам удасканаліў машыну і склаў-бы чарцяжы да 25 красавіка.

4. Абавязаць упаўнаважанага Галоўленкому стварыць спрыяючыя ўмовы для далейшай работы т. Штэйнбэрга па ўдасканаленьні і афармленьні машыны.

5. У выпадку жаданьня т. Штэйнбэрга накіраваць апошняга ва Ўсесаюзны інстытут мэханізацыі для папаўненьня тэхнічных ведаў.

6. Выдаць т. Штэйнбэргу адначасовую дапамогу ў разьмеры 1.500 руб. на выдаткі, зьвязаныя з вынаходзтвам.

7. Даручыць т. Арлоўскаму 20 красавіка паведамець наркомаў Зямляробства аб выкананьні гэтай пастановы.

8. Адказнасьць за далейшае своячасовае прасоўваньне машыны Штэйнбэрга ўскласьці на т. Кандраля.

Раўняйцеся па „Трактарысьце"!

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. (Наш спэц. кар.). Калгас «Трактарыст» падае сапраўдны ўзор баявой падрыхтоўкі да палявых работ. У гэтым калгасе да першага красавіка было пойнасьцю ссыпана і ачышчана ўсё насеньне, адрамантаваны інвэнтар. Створаны страхавы фонд: 10 цэнт. аўса, 3 цэнт. ячменю і 3 цэнт. вікі.

Калгас закантрактаваў пасевы і ўжо падпісаны кантрактацыйныя дагаворы.

У той час, калі рад калгасаў раёну, у рэзультаце безгаспадарчасьці і недапушчальна-неканомнага выдаткаваньня кармоў, апынуўся ў цяжкім становішчы, «Трактарыст» здолеў стварыць бранізаваны фуражны фонд на час палявых работ. Зьдзельшчына ў «Трактарысьце» ўведзена пяць месяцаў назад.

Баявая пастаноўка работы спрыяла развіцьцю новага калгаснага прыліву. «Трактарыст» за апошнія 4-5 месяцаў вырас ўдвая. Пасеўная плошча мае быць пашырана на 200 гэкт.

Калгасьнікі «Трактарыста» пачалі ўжо вывазку гною. Па іх паніны раўняцца члены ўсіх астатніх калгасаў раёну.

ГРАДЗЦКІ.

Барацьба за серадняка

Праваапартуністычнае кіраўніцтва Склімінскага сельсавету прайшло міма спроб кулака адарваць серадняцкую масу ад беднаты

КЛІМАВІЧЫ. (Брыгадзір «Зьвязды».) Вёска Цітаўка, Склімінскага сельсавету. На адным канцы вёскі амаль поруч размясьціліся сельсавет, школа, парт'ячэйка і праўленьне калгасу «Юны камунар».

Калгас складаецца з так званых «аддзяленьняў»: Першамайскае — 15 двароў, Аўчынпікава — 5 двароў і Цэнтральнае Цітаўскае аддзяленьне з 17 двароў, у якое ўваходзяць амаль выключна батракі і беднякі.

Батракі і беднята Цітаўскага аддзяленьня — гэта гонар усяго калгасу.

У мінулым годзе яны тут першымі ўзьнялі сьцяг калектывізацыі і з гонарам утрымалі яго, ня гледзячы на сьвіст палак і каменьняў кулацка-заможнай арэі, якая імкнулася ўсімі сродкамі растаптаць гэты малады парастак новага жыцьця

На чале праўленьня калгасу — тав. Цурупа. Ён-жа адказны сакратар ячэйкі КП(б)Б.

Ёсьць тут і камсамольцы.

Як-жа магло стацца, каб тут, пад носам сельсавету і ячэйкі, пры наяўнасьці моцнага батрацка-бядняцкага ядра і камсамоліі, адкрыта дзейнічаў і вадзіў усіх за нос клясавы вораг?

Адказ адзін — апартуністычная бязьдзейнасьць сельсавету і ячэйкі. Пяройдзем да фактаў.

Кулак вёскі Цітаўка, дзе ёсьць батрацка - бядняцкі калгас «Юны камунар», спэцыяльна арганізоўвае два свае серадняцка - заможных калгасы: «Трудавік»—з 23 гаспадарак і «Селянін»—з 24 гаспадарак (апошнія па хутарох).

Мэта: адкалоць сераднякоў ад батрацтва і беднаты і панесьці іх за сабою, пад шыльдай калгасу стварыць моцную базу для далейшай шкодніцкай працы.

Мэтады працы: усямерная хлусьня, паклёпы і дыскредытацыя серадняцка-батрацка - бядняцкага калгасу «Юны камунар».

У склад гэтых двух новых калгасаў у першую чаргу прапезьлі «людцы» з цьвёрдымі заданьнямі, якіх яны і ня думаюць выконваць, прыкрываючыся зараз шыльдай «калгасьнікаў».

Сельсавет у адносінах да сёньняшніх «калгасьнікаў» — учарайшых заможнікаў, пры дачы im цьвёрдых заданьняў праявіў надзвычай злачынную сэрдабольнасьць. «Калгасьніца» Падабед Аляксандра атрымала заданьне здаць толькі 20 пуд. саломы, пасьля чаго разбазарвае звыш 150 пудоў яе. Тое-ж робіць і рад іншых

А калгасы гэтага-ж сельсавету сядзяць без кармоў. Сакратар і старшыня калгасу Цурупа кідаюцца ў сельсавеце з вёскі ў вёску і шукаюць саломы для калгаснай жывёлы.

На чале праўленьня «Трудавік» і «Селянін», зразумела, аказаліся ня нашы людзі. Старшынёй «Селяніна» засеў нейкі Варапаеў, даводзі «сумняваль-ная фігура», калі прыняць пад увагу яго сыстэматычныя перасты: калгас—аднаасобнікі і аднаасобнікі—калгас.

На сход, які мы, прыехаўшы сюды, іскілкалі, ня гледзячы на персанальныя паведамленьні, — ні адзін з гэтых «старшынь» не зьявіўся. Нас інфармуюць члены праўленьня:

— Насеньня крыху ссыпалі, а больш няма... Трэба каб з раёна нам далі...

— Інвэнтар крыху пашкодзілі, рамантаваць. Вось і ўсё, што можам сказаць.

На рад сапытаньняў сходу гэтыя члены даюць толькі адны адказ:

— А хто яго ведае... Не ведаю, я на лавек малапісьменны...

Як-жа рыхтуецца «Юны камунар»? Насеньне — у ўчыльню. Інвэнтар адрамантаваці. Але ёсьць рад недахопаў у працы праўленьня, вось чаму завяршэньне падрыхтоўкі ідзе сонлымі тэмпамі, самацёкам. Лесу на будаўніцтва яшчэ ня вывезьлі. Справаздач перад аднаасобнікамі не рабілі. Пробных выседаў ня было. Ёсьць выпадкі, калі кармілі неабмалочаным аўсом жывёлу. Да арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельшчыны яшчэ не прыступілі. Цяжка з кормам.

Справа ў іншых калгасах сельсавету ня лепшая. У калгас вёскі Лыткаўка таксама прапезьлі тры гаспадаркі, якія ня выканалі цьвёрдых заданьняў.

У вёсцы Склініна — сыстэматычна зрываюцца сходы.

Наступ кулаку жывецца і працуецца ў Склімінскім сельсавеце шырэйшы.

Старшыня райпрафсавету т. Жылёў, які прымаўсаў да гэтага сельсавету для падрыхтоўкі і правядзеньня сяўбы, двухдзённіка генэральнай праверкі не арганізаваў.

Як-жа разгуюць раённыя кіраўнікі на такое становішча ў Склімінскім сельсавеце?

Яны проста паратылі абнаяць кіруючы склад верхавінкі, не зрабіўшы рашучых выводаў з гэтай справы. І ў выніку—справа абмежавалася тым, што апартуніст Цурупа... пераваздраваў у сельпо. Замест яго старшынёй праўленьня калгасу вылучан рабочы «25-тысячнік» гаварыш Кіс... Мяркуецца таксама вылучыць новага сакратара ячэйкі і старшыню сельсавету. На гэтым, як быццам, справа кончаецца.

Мы кажам, што райком партыі не павінен заваліцца такім простым і павярхоўным вырашэньнем справы. РК павінен моцна ўдарыць па правай практыцы сельсавету і парт'ячэйкі на чале з Цурупай, якія страцілі клясавую чуйнасьць, фактычна ўзялі пад сваю апеку заможнікаў і апынуліся ў палоне кулацкай дзейнасьці.

Да гэтым прыкладзе трэба завастрыць клясавую пільнасьць усёй партарганізацыі раёну. Трэба зацікавіцца вывучэньнем форм і мэтадаў барацьбы клясавага ворага.

Стаўк... раўніцтва, кулак імкнецца ... дзейнасьці ... ня за сабою ... сваю агентуру арганізаваць ... у кулыню ў карты, уцягваючы ў іх ... бедноту (Склімінскі сельсавет), а потым б'е на сходах беднату: «Вота п'яніцы, карцежнікі, гультаі. Яны кредыты прапіюць і у картёй прагуляюць, а мы адказвай будзем...»

Вось на што пачаў біць кулак, не гаворачы аб тым, што вожная памылка, кожны недакоп у справе калгаснага будаўніцтва адразу падхапляецца, раздуваецца да фантастычных разьмераў і шырока «папулярызуецца». Ва ўсім вінаватымі аказваюцца беднякі і батракі. Адсюль у серадняка, як быццам, вывад напроставецца сам сабою: «Серадняк—не давярайся... сьпераўся гэтай «галыцьбы» і не чакай ад яе дабра». Вось гэтага і дабіваецца кулак.

Але-ж гэтага ня можа быць і ня будзе. Батракі і беднята ўжо давялі сваю стойкасьць, моц, уменьне будаваць калгасы. Беднята ўзьняліся, каб паказаць вёшныя прыклады сацыялістычных форм і мэтадаў працы (абрыгады, зьдзельшчына, ліквідацыя абязьлічкі, сацпаборніцтва і ўдарніцтва). Серадняк у сваёй масе ідзе і будзе ісьці за беднатой, але гэта не азначае, што кулак ня зможа нам шкодзіць, што мы можам спакойна пачынаць «на лаўрах калектывізацыі», як гэта рабілі склімінскія працаўнікі.

Э. П. ПАШКЕВІЧ.

„Чырвоны Пуцілавец"—

узор для ўсіх калгасаў Гарадоцкага району

ГАРАДОК. (Ад нашага спэцкора).

Калгас «Чырвоны пуцілавец» адзін з лепшых у Гарадоцкім раёне. За час падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны калгас вырас з 18 да 70 гаспадарак і зараз штодзённа паступаюць заявы ад беднякоў і сераднякоў аб прыняцьці іх у калгас.

«Чырвоны пуцілавец» адзін з першых і лепш за іншых падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Плян сяўбы быў абгаворан на вытворчай нарадзе, на нарадзе актыву і на агульным сходзе калгасьнікаў. Калгас вмсунуў сваё сустрэчны плян, які павялічвае плошчу пасеву на 25 проц. у параўнаньні з заданьнем.

У калгасе ўжо створаны насенныя і кармавыя фонды. Сельска-гаспадарчы інвэнтар адрамантаваны, угнаеньнем калгас ужо таксама забясьпечан. Тры трактары, якія ёсьць у калгасе адрамантаваны і забясьпечаны гаручым.

Каб скарыстаць жаночую рабочую сілу ў часе палявых работ, у калгасе арганізуюцца яслі і сталоўка.

«Чырвоны пуцілавец» першым у раёне перайшоў на зьдзельную аплату працы, вылічаную ў працаднёх. Усе работы разбіты на лёткі, сяродні, цяжкія і кваліфікаваныя. Пры вызначэньні норм у аснову была пакладзена выпрацоўка лепшага ўдарніка.

Зараз уся рабочая сіла разьбіваецца на брыгады, якія прымацоўваюцца да паўных вучастках. Ужо ліквідавана абязьлічка. Коні, збруя і прылады прымацаваны да поўнага калгасьніка, які поўнасьцю за іх адказвае.

Арк. Зарубежны.

Калгас імя „Зьвязды"

ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА СЯЎБЫ

75 проц. вёскі Бібікі ў калгасе

НАРОЎЛЯ. (Наш кар.). Калгас імя газэты «Зьвязда» арганізаваўся ў 1930 годзе. Зараз калгас яднае 75 проц. гаспадараж вёскі Бібікі. Такога росту калгас дабіўся дзякуючы добра пастаўленай вытворчасьці і сыстэматычнай рабоце з беднатой вёскі.

Калгас «Зьвязда» жывёлагадоўчага напрамку. Ён мае 140 дойных кароў, звыш 60 цялят, 60 коняй, 42 сьвінні.

За кароткі час калгас набудаваў абору на 100 штук, сілосную вежу, у якой засілсавана 165 тон масы, дзякуючы чаму калгас здолеў пракармідь вялікае стада цялую зіму.

7-га красавіка адбыўся пробны выезд калгасу ў поле, які паказаў, што да веснавой сяўбы калгасьнікі поўнасьцю падрыхтаваны. Інвэнтар увесь спраўны, насеньнем забясьпечаны. Горн з кармамі.

Вытворчы плян і рабочая праграма веснавых работ калгасам складзены. Уся працоўная сіла разьбіта на брыгадах, прычым усе работы калгасу пераведзены на зьдзельшчыну.

Г.

31,1 проц.

беднякоў і сераднякоў у калгасах

ТАЛОЧЫН. Із НОВЫХ КАЛГАСАЎ, ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ПРОЦАНТУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НА 2,5 — ВОСЬ ВЫНІК ПЕРШАЙ ДЭКАДЫ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ У ТАЛОЧЫНСКІМ РАЁНЕ.

31,1 ПРОЦ. БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК РАЁНУ ЎЖО ЎСТУПІЛА У КАЛГАСЫ.

ДАСЯГНУТЫ ТАКСАМА ПЕРАЛОМ У ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ. ПЛЯНЫ ДАВЕДЗЕНЫ ДА 90 ПРОЦ. КАЛГАСАЎ І 97 ПРОЦ. АДНААСОБНІКАЎ. ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР ВЫКАНАНЫ Ў РАЗЬМЕРЫ 63 ПРОЦ. КАНТРАКТАЦЫЯ ЛЬНУ ВЫКАНАНА Ў РАЗЬМЕРЫ 89 ПРОЦ., КАНАПЛЬ — 153 ПРОЦ., ГАРОХУ — 150 ПРОЦ., ГАРОДНІНЫ — 104 ПРОЦ.

7 новых калгасаў

за першую дэкаду

АСІПАВІЧЫ. ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА СЯЎБЫ І ПРАПРАЦОЎКА ПАСТАНОЎ VI ЗЬВЯЗДУ САВЕТАЎ ДАЛІ ВЯЛІЗАРНЫ ЗРУХ У СПРАВЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ ПА АСІПАВІЦКІМ РАЁНЕ АРГАНІЗАВАНА 7 НОВЫХ КАЛГАСАЎ, У ЯКІЯ ЎЛІЛІСЯ 140 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. АПРАЧА ТАГО АРГАНІЗАВАНА 5 ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП І ГА ВЯРБОВАЧНЫХ КАМІСІЯ.

ЗБОРОСКІ І ВЕРАНІОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ ПОЎНАСЬЦЮ ЗАКОНЧЫЛІ КАНТРАКТАЦЫЮ ЯРАВЫХ.

КАЛГАСЫ РАЗАМ З АДНААСОБНІКАМІ ПРАВЕЛІ РАД ПРОБНЫХ ВЫЕЗДАЎ У ПОЛЕ, ЯКІЯ ПАКАЗАЛІ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦЬ ДА ПАЧАТКУ СЯЎБЫ.

КУРГАНАЎ.

„Левыя" перагібшчыкі выконваюць заказ кулака

Замест чысткі кулакоў чысьцяць беднякоў, сераднякоў і батракоў

ЧАШНІКІ.

У сувязі з ачысткай калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў у Чашніцкім раёне дапушчаны абураючыя «лявацкія» перагібы, якія ў некаторых мясцох суправаджаліся махровай праваапартуністычнай практыкай

Ачыстка калгасаў ад антыкалгасных элемэнтаў праходзіла па прынцыпе... чысткі савецкіх устаноў. У гэтай «рабоце» прынялі ўдзел ня толькі працаўнікі райкалгассаюзу, але некаторыя члены бюро райкому. Вось некалькі прыкладаў таго, як праводзілася чыстка.

У калгасе «Х Кастрычнік» (Цяпінскі сельсавет) чыстка працягвалася чатыры дні. Праз чыстку былі прапушчаны ў паасобку ўсе калгасьнікі: батракі, беднякі, сераднякі. Пасьля камісія пачала выносіць вымовы, пастановы аб выключэньні з калгасу ўмоўна, на тэрмін больш.

Яшчэ больш абураюча праходзіла чыстка ў калгасе Лазукоўскага сельсавету, дзе чысьцілі нават «25-тысячніка» тав. Януліса, якому была вынесена вымова.

У калгасе Дварэцкага сельсавету ў выніку чысткі з калгасу былі выключаны беднякі і сераднякі і нават такія, якія членамі калгасу ня лічыліся. Адначасова-ж чыстка не закранула такіх членаў праўленьня калгасу, як б. дзяка і раскулачанага кулака.

Толькі праз некаторы час райком партыі даведаўся аб гэтых абураючых скажэньнях лініі партыі і даў дырэктыву аб іх выпраўленьні. Памылкі і скажэньні ўсё-ж далёка ня ўсюды выпраўлены. Як відаць, райком не правяраў выкананьня сваёй дырэктывы. Увага мас калгасьнікаў ня была канцэнтравана вакол гэтых скажэньняў дырэктыў партыі. Сутнасьць скажэньняў ня была шырока растлумачана. Факт такі, што рад няправільна вычышчаных калгасьнікаў і зараз ня ведаюць: ці зьяўляюцца яны членамі калгасу, ці не.

Адзначаныя «лявацкія» перагібы, якія часам перапляталіся з правай практыкай, адмоўна адбіліся на замацаваньні існуючых калгасаў і арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Трэба неадкладна выправіць дапушчаныя скажэньні, моцна ўдарыўшы па правых і «левакох», якія сваімі паводзінамі і практыкай дапамагалі кулаку ў яго шкодніцкай антыкалгаснай агітацыі.

Ец. і Ам.

Насеньне і кантрактацыя—

слабыя вучасткі падрыхтоўкі

БАРЫСАЎ. Патрэбнага пералому ў падрыхтоўцы да вясны першая дэкада генэральнай праверкі па раёне яшчэ не дала.

Насенныя фонды і кантрактацыя ўсё яшчэ застаюцца слабымі вучасткамі падрыхтоўкі да сяўбы. Плян загатовак насеньня выкананы на 30 проц. Камітэты сялянскай узаемадапамогі сэмпалі толькі 22 проц. пляну. Па індывідуальным сэктары стварэньне страхавых насенных фондаў выкананы толькі на 8 проц.

Плян кантрактацыі на 15-га красавіка ў раёне выкананы на 52 проц. З 72 калгасаў кантрактацыйныя дагаворы падпісаны толькі 39. **11 сельсаветаў яшчэ не заключылі ні аднаго кантрактацыйнага дагавору з індывідуальнікамі.**

За дэкаду праверкі ў калгасы ўступіла ўсяго 71 бядняцка-серадняцкая гаспадарка. Тлумачыцца гэта тым, што бядняцка-серадняцкія сходы арганізуюцца без належнай падрыхтоўкі.

На зьдзельшчыну пакуль што пераведзена 26 калгасаў, прычым поўнасьцю ўжо ажыцьцявілі зьдзельшчыну калгасы «Рой», Мечанскага сельсавету, і «Кастрычнік», Забашоўскага сельсавету. У гэтых калгасах ужо вызначаны нормы выпрацоўкі, рабочая сіла разьбіта на брыгады, ліквідавана абязьлічка.

Н.

У ПАЛОНЕ У КУЛАКОЎ

ПУХАВІЧЫ Пухавіцкі раён у справе падрыхтоўкі да другой сяўбы ня ўзяў яшчэ бальшавіцкіх тэмпаў. На сёньняшні дзень насеўныя пляны яшчэ не даведзены да 11 калгасаў і звыш 8 тысяч аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ссыпка насенных фондаў у калгасах выканана толькі ў разьмеры 59,7 проц.

У радзе калгасаў яшчэ ня створаны прэміраваныя фуражныя фонды на час палявых работ і не адрамантаваны поўнасьцю сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Плян кантрактацыі па калгасах выкананы ў разьмеры 92,75 проц. Рэзка адстае індывідуальны сэктар, які выканаў плян толькі на 32,5 проц.

Кулацтва вядзе шалёную агітацыю супроць калгасаў. Раённыя арганізацыі не даюць гэтай агітацыі амаль ніякага адпору. Кулакі спрабуюць разбурыць калгас. Так, у Шашчым сельсавеце з калгасу выступіла 21 гаспадарка, у Баяцкім сельсавеце—16 гаспадарак. Тлумачыцца гэта тым, што гэтыя сельсаветы не вядуць ніякай масава-растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і знаходзяцца ў палоне ў кулакоў.

Пухавіцкая раённая арганізацыя павінна зараз-жа выкінуць апартуністаў з сельсаветаў, сапраўдна па-баявому ўзяцца за падрыхтоўку да сяўбы.

ДРОЗД.

Пад суд зрыўшчыкаў кантрактацыі

Гарадоцкая спажкаапэрацыя ня выконвае сваіх абавязацельстваў перад кантрактантамі

ГАРАДОК. (Наш кар.).

Гарадоцкі раён зьяўляецца ільнаводчым раёнам. На сёньняшні дзень закантрактавана па аднаасобным сэктары толькі 50 проц. пляну, галоўным чынам, за лік некалькіх сельсаветаў.

Першым і ў гэрмін выканаў сваё заданьне Аляксандраўскі сельсавет, які замест 497 гэкт., вызначаных плянам, закантрактаваў 461 гэкт. Першамайскі, Выраўлянскі і Езярышчанскі сельсаветы скончылі кантрактацыю, а Салдуцінскі перавыканаў плян на 55 гэкт.

Злачынна марудна праходзіць кантрактацыя па Асінавіцкім, Ганьчанскім, Вайханскім, Біскатаўскім і Боліцкім сельсаветах, якія выканалі свае пляны кантрактацыі толькі на 8-10 проц.

Горнаўскі, Пальмінскі, Мехаўскі, Пралетарскі і інш. сельсаветы на сёньняшні дзень не закантрактавалі ні аднаго гэктара.

Галоўнай прычынай невыкананьня плянаў кантрактацыі зьяўляецца тое, што адстаючыя сельсаветы нічога не зрабілі, каб давесьці плян ня толькі да двароў, але нават і да вёсак. Кантрактацыйныя пляны не абмяркоўваліся на бядняцка-серадняцкіх сходах. Слабому разгортаньню кантрактацыі спрыяе дрэнная работа каапэрацыі. Так, бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, якія здалі па кантрактацыі ў мінулым годзе свае лёны, спажкаапэрацыя не дадала 90 тон збожжа. Бедняцкаяцкае некалькі раз давай гарадоцкая спажкаапэрацыі гарады на гэтае збожжа, але заўсёды атрымлівай наступны адказ, «У нас збожжа ёсьць поўнасьцю распісвыя нарады на збожжа нам непатрэбны». У выніку не хапіла 80 тон збожжа для прэміраваньня кантрактантаў. Ня дзіва, што з боку сялянства няма, належнай упэўненасьці ў выкананьні каапэрацыяй сваіх абавязацельстваў.

Частковa вінаватыя ў зрыве кантрактацыі і райкаапсаюз, які зусім не сачыў за работай упаўнаважаных, камандыраваных у сельсаветы для правядзеньня кантрактацыі. Ні разу ня была заслухана інфармацыя упаўнаважаных аб праробленай імі рабоце.

Партыйная і савецкая арганізацыі не вядуць належнай работы сярод беднаты. Кулацкая агітацыя не атрымлівае адпору.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Ні аднаго новага калгасу

БЯЗЗІНА. У Мешчаніцкім сельсавеце, Бярэзінскага раёну, падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны праходзіць без усякай сувязі з арганізацыяй калгаснага прыліву. За апошні час ня створан ні адзін новы калгас.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі знаходзяцца ў баку ад калектывізацыі і падрыхтоўкі да сяўбы. Старшыня сельсавету Жуковіч у самы разгар падрыхтоўкі паехаў па сваіх асабістых справах.

Страхавыя і насенныя фонды як у калгасах, так і індывідуальным сэктары яшчэ ня створаны.

Брыгадзір.

Праверка праверкі

Аб брыгадах, якія ня ведаюць, што робяць

РАГАЧОЎ. (Брыгадзір «Зьвязды»).

Канкрэтныя вынікі першых трох пяцідзёвак праверкі яшчэ не забясьпечаюць пасьпяховага выкананьня праграмы бальшавіцкай сяўбы ў Рагачоўскім раёне. За першую дэкаду праверкі арганізаваны толькі 3 новыя калгасы. Уступіла ў існуючыя калектывы 80 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэта ўсё раўнае ўзятае дае прырост кал

Энэргетыка і апал—гэта торф

Стварэньне магутнай энэргетычнай апалавай базы зьяўляецца адным з важнейшых умоў пасьпяховага вырашэньня задач індустрыялізацыі краіны сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Барацьба за дасягненьне складала адзін з галоўных вучасткаў работы партыі на працягу ўсяго прыйду сацыялістычнай будоўлі, дзе асабліва важнае значэньне праблема энэргетыкі і апалу набыла ў рэканструкцыйны перыяд, калі пачалі ўступаць у строй дзесяткі гігантаў цяжкай індустрыі, сотні новых прамысловых прадпрыемстваў. Энэргетыка і апал — адно з асноўных звяньняў выкананьня народна-гаспадарчага плану трэцяга году, ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады.

Ва ўмовах БССР вырашэньне пытаньня энэргетыкі і апалу непарыўна зьвязана з ПРАБЛЕМАЙ ТОРФУ. Вялізарныя прыродныя тарфяныя багацьці БССР робяць не сапраўдным «тарфяным Данбасам», адкрываюць перад усімі галінамі народнай гаспадаркі бліскучыя пэрспэктывы разьвіцьця.

Гэтыя пэрспэктывы цяжка пераацаніць. Беларуская прамысловасьць у выглядзе торфу мае невычарпальны МАСІЎ ЗЫЯ апаловых рэзэрваў. Торф — магутная база электрыфікацыі краіны. Торф—база газафікацыі трактарнай гаспадаркі. Торф — аб'ект самай разнастайнай прамысловай і хэмічнай пераапрацоўкі. Торф — матар'ял для будаўніцтва прамысловасьці, для сельскай гаспадаркі. Торф дазваляе выкарыстаць з апалавага балянсу каштоўнейшую галіну народнай гаспадаркі — лес, дае магчымасьць найбольш рацыянальнага выкарыстаньня лясных масываў.

Торф — важнейшы фактар усёй сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі БССР.

Вось чаму пастанова Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б аб рабоце тарфяной прамысловасьці, гэтымі днямі апублікаваная ў друку, набывае значэньне выключнай палітычнай важнасьці, становіцца сапраўды гістарычным дакументам.

Пастанова дае разгорнутую праграму барацьбы за торф, ставіць гэту праблему ва ўсёй яе паўнаце і ўзаемасувязі з усёй народнай гаспадаркай БССР.

ЦК канстатаваў «наўпасьць у радох партыйнай арганізацыі агульнай недаацэнкі народна-гаспадарчага значэньня торфу для забесьпячэньня індустрыялізацыі БССР».

Праблема торфу яшчэ не знайшла патрэбнага вырашэньня ў адпаведнасьці са сваім вялізарным гаспадарча-палітычным значэньнем.

Тэмпы і аб'емы торфараспрацовак яшчэ надзвычай нізкія. Удзельная вага торфу ў апалавым балянсе прамысловасьці ў 1930 годзе складала ўсяго толькі 16,4 проц. Тарфяныя фонды, структура торфу ў розных раёнах ня вывучаны. Надзвычай мала робіцца ў галіне перапрацоўкі торфу, у асабліваści хэмічнай. Навукова-дасьледчая работа наогул пастаўлена нездавальняюча. Слаба праводзіцца механізацыя здабычы і транспартаваньня. У 1930 годзе прамфінплян Белторфаб'яднаньня выкананы усяго толькі на 69,4 проц., мела месца павышэньне сабекошту на 21 проц. замест плянавага зьніжэньня на 10 проц.

За неадкладнае зьнішчэньне буйнейшых недахопаў у рабоце тарфяной прамысловасьці трэба неадкладна ўзяцца з усёй рашучасьцю. Зусім недапушчальна тое становішча, якое зараз мае месца ў гэтай важнейшай галіне народнай гаспадаркі.

ЦК паставіў перад тарфяной прамысловасьцю бліскую задачу: «ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ НА ПРАЦЯГУ ТРОХ ГОД ТАКОЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ, ЯКОЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛА-Б, ЯК МІНІМУМ, ПЕРАВОД У ГЭТЫ ТЭРМІН УСЁЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ВЫПРАЦОЎКІ ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ І АСНОЎНЫХ КУЛЬТУРНА - БЫТАВЫХ УСТАНОЎ ПРАМЫСЛОВЫХ ЦЭНТРАЎ НА ТАРФЯНЫ АПАЛ».

Значэньне гэтай пастановы для ўсёй народнай гаспадаркі БССР вялізарнае. Закон ажыцьцяўленьня яго неабходна мабілізацыя сіл усёй КП(б)Б, усёй рабочай клясы.

У сваёй пастанове ЦК указаў практычныя шляхі вырашэньня тарфяной праблемы.

Пытаньнем першачарговай важнасьці зьяўляецца РАСПРАЦОЎКА ГЕНЭРАЛЬНАГА ПЛЯНУ РАЗВІЦЬЦЯ ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, на аснове ўліку ўсіх патрабаваньняў народнай гаспадаркі, увязкі праграм прамысловага будаўніцтва і электрыфікацыі. На дзяржпляне ўсталёўваецца сур'ёзнейшая і адказная задача, да ажыцьцяўленьня якое трэба прыступіць неадкладна. Генэральны плян павінен стаць прадуктам творчасьці і ўласнасьцю найшырэйшых мас працоўных, павінен стаць сьцягам мабілізацыі мас на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Важнейшую задачу складае патрэбная пастаноўка НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧАЙ РАБОТЫ, прыцягненьне да вырашэньня тарфяной праблемы лепшых прадстаўнікоў навукі, адданых справе пралетарскай рэвалюцыі. Навукова-дасьледчыя арганізацыі павінны сур'ёзна паварнуцца тварам да торфу, папулярызаваць ідэю «тарфяного Данбасу» ў найшырэйшых колах працоўнага насельніцтва.

ПРАБЛЕМА КАДРАЎ стаіць для тарфяной прамысловасьці з усёй вострасьцю. Рэзкі недахват спэцыялістаў і кваліфікаваных рабочых сілы павінен быць зьнішчан ва што-б там ні стала. Органам НКА і НКП трэба шчыльна падысьці да пытаньняў тарфяной прамысловасьці, паставіць у парадак дня сваёй работы падрыхтоўку кадраў тарфянікаў. Пастанова ЦК аб забесьпячэньні на працягу трох год тарфяной прамысловасьці 75 проц. пастаянных рабочых павінна быць поўнасьцю выканана.

Вырашэньня тарфяной праблемы нельга мысьліць без ажыцьцяўленьня цэлай сыстэмы мерапрыемстваў па РЭКАНСТРУКЦЫІ ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ ТАРФЯНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ. Пытаньні мэханізацыі падрыхтоўчых работ і здабычы, транспартаваньня, грамысловага абсталяваньня, тэхнічнага аснашчэньня ў цэлым, — усё гэта зьяўляецца асноўнай прадпасылкай для пасьпяховага выкананьня балявых праграм, вызначаных пастановай ЦК.

Торфпрамысловасьць адносіцца да тых вучасткаў народнай гаспадаркі, якія найбольш пацярпелі ад дывэрсыйна-шкодніцкай работы контр-рэвалюцыйных шкодніцкіх арганізацый. Зусім натуральна, што шкодніцкі ў сваёй злачынной дзейнасьці імкнуліся парэзіць іменна гэтыя важнейшыя нэрвы гаспадарчага арганізму краіны. На ВЫКАРЧОЎВАНЬНЕ РЭШТАК ШКОДНІЦТВА, на рашучае пересячэньне ўсіляких шкодніцкіх спроб клясавага ворага неабходна мабілізаваць найшырэйшыя масы рабочай клясы ні на мінуту не аслабляць сваёй пралетарскай пільнасьці.

Адной з прычын, якія нараджаюць нізкія паказальнікі тарфяной прамысловасьці, зьяўляецца БУЙНЕЙШЫЯ НЕДАХОПЫ Ў РАБОЦЕ ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. Асабліва дрэнная справа ў адносінах мясавай палітычна-выхаваўчай работы. Перад партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі торфпрамысловасьці стаіць задача рэзкага паляпшэньня якасьці ўсёй сваёй работы, яе неадкладнай перабудовы ў напрамку павароту «тварам да вытворчасьці», разгортаньня сацыялістычнага і ўдарніцтва, вупраўленьня тэхнікай вытворчасьці.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове даў разгорнутую праграму барацьбы за торф. За ажыцьцяўленьне гэтай пастановы трэба ўзяцца неадкладна, закасаўшы рукавы. Зусім зразумела, што тарфяная праблема — справа ня толькі торфапрамысловых арганізацый, на іх павінна быць скансэнтравана ўвага ўсёй пралетарскай грамадзянскасьці горадоў і вёсак, усіх партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і савецкіх арганізацый.

Пралетарыят БССР, набыўшы пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК вялізарныя дасягненьні на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, даб'ецца рашаючых посьпехаў у галіне вырашэньня і тарфяной праблемы, забясьпечыць гэтым далейшы росквіт народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі.

Узяўшыся па-баявому за рэалізацыю пастановы ЦК КП(б)Б, даючы бязьлітасны адпор апартуністычным элементам, якія граюць на руку клясаваму ворагу, дапамагаюць шкодніцам, мы шпаркімі тэмпамі [illegible] торфапрамысловасьць на [illegible] забясьпечыць [illegible] базу, [illegible] сацыялістычны [illegible] народны гаспадарні, завяршэньне пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Аб брыгадзірах, гастралерах, праверцы і дапамозе

На вясковыя партарганізацыі ўскладаюцца гіганцкі вялікія і складныя задачы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ажыцьцяўленьне ідэуцу суцэльнай калектывізацыі і на аснове ліквідацыі кулацтва як класа, патрабуе ад усіх партарганізацый, усіх ячэек умелага спалучэньня гэтай работы з усімі важнейшымі палітычна-гаспадарчымі кампаніямі, якія партыяй праводзяцца на вёсцы. Яскрав часамі і не хапае гэтага ўмелага спалучэньня і, натуральна, у правядзеньні раду важнейшых мерапрыемстваў асобныя вясковыя партарганізацыі адстаюць.

Ім патрэбна дапамога і кіраўніцтва ў першую чаргу з боку ўсіх цэнтральных устаноў і арганізацый. Яна (гэта дапамога) у першую чаргу ажыцьцяўляецца пайсьці на лінію ўдасканаленьня свайго кіраўніцтва ўсімі звяньнямі, на ўсіх ведамствах апарату рэйкому, які зьяўляецца асноўным вузлом сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Па-другое, дапамога — пайсьці на лінію жывога ліквідацыі кіраўніцтва раённых устаноў з боку наркаматаў і цэнтральных гаспадарчых і кааперацыйных аб'яднаньняў. Аднак гэтага мы яшчэ ў радзе выпадкаў не дасягнулі.

На працягу апошняга перыяду, прыкмеці пасьля ліквідацыі акруг, наркаматы і цэнтральныя гаспадарча-кааперацыйныя установы пасылаюць шмат сваіх работнікаў у раёны. Справа неабходная і важная. Намагчы рэйкомам партарганізацыі, раённаму савецкаму і гаспадарчаму апарату разьвіваць бачным тэмпам работы — абавязак усіх цэнтральных устаноў. Гэта бясспрэчна.

Аднак, уся бяда заключаецца ў тым, што цэнтральныя установы, ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, мала ці зусім ня цікавяцца пытаньнем аб тым, чым займ'ецца, што робіць, як памлачаюць мясцовым арганізацыям у рабоце пасланыя брыгадзіры, упаўнаважаныя і г. д.

Між тым, галёка ня ўсе брыгадзіры і ўпаўнаваж. ныя працуюць так, як гэтага патрабуюць дырэктывы ЦК КП(б)В і СНК БССР. Падаймо некаторыя факты, узятыя намі з аднаго толькі Буда-Кашалёўскага раёну.

У сьнежні месяцы 1930 г. райпартарганізацыя пачынала разгортваць работу па мабілізацыі сродкаў. Гэта важнейшае пытаньне было абмеркаванае на бюро райкому, на заўтра — на «чацьвёрцы», на наступны дзень на прэзыдыуме РВК. Раённы актыў мабілізаваны і пасланы на сельсаветах для разгортваньня практычнай работы. Толькі разьехаліся работнікі на сельсаветах, як прыбыў упаўнаважаны ЦК і СНК тав. Дзьнісаў.

— Як у вас з мабілізацыяй сродкаў? — пытае ў сакратара райкому.

— Пакуль што дрэнна. — адказвае апошні.

— Вы ня прымаеце мер! Зараз-жа склікаць бюро райкому, насядзьнае «чацьвёрку», прэзыдыум РВК, мабілізаваць людзей.

— Ды як-жа, людзі ў сельсаветах?

— Калі мне ня зробіце гэтага зараз, вазьму ў Менск!

Ледзь сакратар райкому ўгаварыў упаўнаважанага і ўпэўніў яго ў бясплодасьці насядзацельства.

Прайшло некалькі дзён. Вярнуліся з сельсаветаў пасланыя райкомам людзі, падагулілі работу, вынячылі нерэпрэзэнты і разьехаліся зноў. Разам з імі выехаў у адзін з сельсаветаў і упаўнаважаны.

У той-жа дзень як разьехаліся людзі, прыязджае работнік НКФ — зноў-такі па мабілізацыі сродкаў.

Зноў званіка з сакратаром (праўда, куды мудрэйшая чым была з боку ўпаўнаважанага), зноў работнік Наркамфіну патрабуе склікаць бюро райкому, насядзьнае «чацьвёрку», прэзыдыум РВК.

Прыйшлося склікаць насядзьнае «чацьвёрку». Работнік Наркамфіну пазасядаў і... супакоіўся. Пасьля насядзьня ўжо гаварыў з раённымі работнікамі «натхнуто-любезно».

Нічога дзіўнага. Бюракрат і чыноўнік, чалавек, які ня любіць жывой справы, кажуць, заўсёды супакойваецца пазасядаўшы, пасьля прыняцьця рэзалюцыі, хоць-бы яна была і агульная, неканкрэтная, хоць-бы яна і ня выконвалася. Толькі работнік Наркамфіну выехаў у сельсавет — прыязджае трэці — таксама па праверцы мабілізацыі сродкаў і таксама, як і другі і першы. І... праўда, гэты скіпідар пасьлязьнае не патрабаваў, але і без таго атрымліваецца як у той казцы «пра белага бычка». Гэты апошні пахаў па Буда-Кашалёўскім сельсавеце і такога здушства нарабіў, што прыйшлося ў месцы яго прабываньня пасылаць спэцыяльнага чалавека выпраўляць «левыя» перагібы.

Далей. Каля 5 красавіка прыязджае ў Буда-Кашалёўскі раён загадчык Жлобінскай канторы Плодагародніны тав. Каган па бульбазагатоўках. Сядзіць у раёне з дні. І што за гэты час ім зроблена? На бюро РК, а потым на прэзыдыуме РВК прыняты далье рэзалюцыі. І чалавек задаволен, заспакоен і з вялікім гонарам гаворыць аб тым, што ў раёне нічога не рабілася, што ён зрушыў справу, кладзе рэзалюцыі ў парэль і самазадаволена «праробленай гіганцка-вялікай работай» адыжджае ў Жлобін.

Ці-ж ня пустое гэта, якому непатрэбнае гастралёрства? Ці-ж не бюракратычная, сьляпая вера ў напісаную паперку?

Гэта замест таго, каб правесьці нараду з загатоўцамі, дапамагчы ім сваёй парадай і непасрэднай працай.

І яшчэ адзін выразны факт «дапамогі» ў рабоце райпартарганізацыі.

Маскоўскае спажывецкае таварыства пасьлала на Беларусь для дапамогі партарганізацыям у бульбазагатоўках 16 брыгадзіраў, на чале з упаўнаважаным Наркамснабу СССР тав. Герасімавым. Сам тав. Герасімаў са сваім памочнікам працуе ў Менску, а брыгадзіры пасланы ў раёны.

Двое з таварышоў брыгадзіраў у Буда-Кашалёўскім раёне, адмовіліся па прапанове раённых арганізацый выехаць у сельсаветы, а проста пахажваюць цэлымі днямі з райкому ў райкаапсаюз, з райкаапсаюзу — у райгандаль, у сталоўку, гасьпіцу і г. д. А на вёску ездзь, — а ці блізка. Аказваецца ў іх ёсьць «цадстава». Атрымана такая тэлеграма з Менску:

«Буда-Кашалёўская райгандальаддзел — брыгадзіру Ларыну.

Расстаў брыгадзіраў Буда Уваравічы Рэчыца адкаму Чачэрск Ветка адкаго сяла не выяжджайце прымайце меры раённых арганізацый. Дзесятаму паведамі рабоце мне

Герасімаў».

Проста не работа, а шахматная гульня — расстаў фігуры па месцах — і баста. А сам сядзі ды гляді як раённыя арганізацыі шавеляцца ды, толькі язай — у адносінах іх прымай меры!

Як гэта проста ўсё з бюракратычнага пункту гледжаньня і як недарэчна пры разглядзе праз прызму здаровага сэнсу і карысьці для справы.

Нельга абмінуць і таго факту, што ўсе пасьведчаньні камандыраваных па вызначаюць іх канкрэтных задач, а пішуцца ў грознай і лёканічнай форме «камандыруецца для праверкі...» І гэтых праверак па адным і тым-жа пытаньні робіцца столькі, што ў раёне не пасьпяваюць разьмяжаць пасланых ужо цэнтральным установам зводкі для асоб, што прыехалі правяраць. Пры чым кожны з правершчыкаў ні за што ня хоча зашыцца ў ролі чарнавога работніка, памочніка райпартарганізацыі, а ня інакш, як прадстаўляе з сябе штурхача. Ад гэтых «штурхачоў» раённаму кіраўніцтву ня толькі няма магчымасьці варушыцца, а нават цяжка дыхаць.

Мы ставім перад Цэнтральным камітэтам і перад ЦККРСІ пытаньне аб упарадкаваньні і нармаваньні ўсялякіх пасылак работнікаў у раёны, аб арганізацыі дзейнага кантроля і кіраўніцтва іх працай.

Раённыя-ж камітэты партыі павінны заўсёды строгі кучот прыбываючых таварышоў, канкрэтна адзначаючы, колькі той ці іншы таварыш быў у раёне, на якой і канкрэтна якую праведёў работу.

Ап. Градзэцкі.

Аб выробе і рэалізацыі мінэральных угнаеньняў

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Выслухаўшы даклады Белхэмпрамаб'яднаньня ВСНГ тав. Кіселя і кіраўніка Беларускага аддзяленьня акцыянэрнага таварыства «Минудобрение» тав. Місьнікава аб выробе, завозе і рэалізацыі мінэральных угнаеньняў для весьнавой пасеўнай кампаніі, Камісія Выкананьня пры СНК БССР адзначае, што:

а) завоз мінэральных угнаеньняў да вясновай пасеўнай кампаніі у савецкіх і калектыўных гаспадарках праходзіць вельмі марудна;

б) рэалізацыя мінэральных угнаеньняў у калгасах, ня гледзячы на назначаны завоз іх, праходзіць зусім дрэнна — рэалізавана толькі 32,4 проц. угнаеньняў;

в) выпрацоўка фасфарытнай мукі ў асобным квартале 1980 г. і ў першым квартале 1931 г. заводамі Белхэмпрамаб'яднаньня выканана толькі на 62,1 проц.;

г) Народным Камісарыятам Земляробства і Беларускім аддзяленьнем акцыянэрнага таварыства «Минудобрение» не арганізаваны належны падлік і кантроль за рэалізацыяй мінэральных угнаеньняў.

Адзначаючы паказанае вышэй, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Белкалгасцэнтр, Белільпакапляводсаюз, Белмалжывёлсаюз і Белсадгарадсаюз, пад адказнасьць т.т.: Міцькова, Лапіса, Жаронскага і Пазмарова, неадкладна ўжыць рашучыя захады для узмацненьня рэалізацыі мінэральных угнаеньняў у калгасах з тым, каб рэалізацыя іх была скончана да 1-га мая 1931 г.

2. Прапанаваць старшыням: Мазырскага, Рагачоўскага, Бабруйскага, Слуцкага і Хойніцкага раённых выканаўчых камітэтаў, у якіх рэалізацыя мінэральных угнаеньняў ідзе зусім слаба, заразжа ўжыць захады да прасоўваньня іх у калгасы.

3. Абавязаць Белхэмпрамаб'яднаньне, пад адказнасьць тав. Кіселя, ужыць тэрміновыя захады для поўнага выкананьня фасфарытнымі заводамі Белхэмпрамаб'яднаньня праграмы за красавік, а таксама да пачатку вясновай сяўбы поўнасьцю пакрыць недавыпрацоўку першага кварталу бягучага году.

4. Прапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі БССР і Белхэмпрамаб'яднаньню правесьці тэхнічную рэканструкцыю фасфарытных заводаў і сьвячасова падрыхтавацца да выпрацоўкі фасфарытнай мукі для асеньняй пасеўнай кампаніі.

5. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Беларускаму аддзяленьню акцыянэрнага таварыства «Минудобрение» наладзіць належны падлік і кантроль за завозам і рэалізацыяй мінэральных угнаеньняў.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. ЭЛЬКІН.

15 красавіка 1931 г.
Менск.

ПРАТЭСТ МІЛЬЕНАУ

супроць пагромаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне,

супроць наглых антысавецкіх правакацый і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі

З-за крывавага тэрору праглядвае жахлівы твар інтэрвэнцыі

Канфэрэнцыя пераменьнікаў Сьмілавіцкага раёну з абурэньнем пратэсту супроць белага тэрору фашысцкіх катаў у Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

Польскі фашызм — гэты верны васал французкага імпэрыялізму—вядзе шалёную падрыхтоўку да ўзброенага нападу на СССР. Аб гэтым яскрава сьведчыць вялізарны ваенны бюджэт, які ідзе на утрыманьне войска і набудовы ліцэнтаў—ваенных заводаў.

З другога боку гэтая інтэрвэнцыйная падрыхтоўка польскага фашызму праяўляецца ў крывавым зьдзеку нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных мас акупаванай Зах. Беларусі і Зах. Украіны. У гэтай орыі разьюшнай палітычнай прымаюць удзел беларускія нац.-фашысты з Астроўскім і Гуцкевічам на чале, якія, абараняючы інтарэсы беларускай буржуазіі і кулацтва, праладзіла фашысцкай дэфэнзыве.

Разгром беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьне», ліквідацыя ўсіх асьветна-культурных установаў працоўнага сялянства, як ТВШ і яленскі кооперацыйны банк, пранакаваны арышт тав. Тарашкевіча, масавыя арышты і катаваньні рэвалюцыйных рабочых і сялян у турмах і фашысцкай дэфэнзыве [illegible] сьведчаць аб тым, што польскі фашызм, сумесна з нац.-фашызмам беларускім, падрыхтоўвае ў акупаванай Зах. Беларусі спакойны тыл для ваенных дзеньняў.

Канфэрэнцыя пераменьнікаў у адказ на тэрор фашысцкіх акупантаў пастанаўляе палажыць усе сілы для правядзеньня па-ўдарнаму другой бальшэвіцкай веснавой пасеўнай кампаніі. Канфэрэнцыя заклікае ўсіх пераменьнікаў пашырыць кагласныя роды шляхам масавага ўступленьня ў калгасы.

Нехай жыве рэвалюцыйны рух Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Нехай жыве сусьветны Кастрычнік!

Далучаем свой голас пратэсту

Заслухаўшы інфармацыю аб крывавай оргіі фашысцкага тэрору над працоўнымі масамі Зах. Беларусі і Зах. Украіны, агульны сход рабочых цырульнікаў менскага чырвонага крыжу адзначае: польскі фашызм шляхам душэньня нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне імкнецца падрыхтаваць, узброены напад на краіну пралетарскай дыктатуры.

У гэтай агідной рабоце фашысцкіх акупантаў дзейную дапамогу нясуць беларускія нац.-фашысты в Астроўскім, Луцкевічам і К° на чале.

Разгром беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьне», зьверскія прысуды над пасламі гэтага клюбу, разгром ПКО-лянцы і ўсіх культурна-асьветных установаў працоўнага сялянства, арышты і нябачанымі катаваньні ў фашысцкіх ахранках і турмах найбольш адданых змагароў за рабоча-сялянскую ўладу—вось крывавы плён супрацоўніцтва беларускіх нац. фашыстаў з дэфэнзывай.

Мы, рабочыя цырульнікі, узьнімаючы свой пралетарскі пратэст супроць зьверстваў польскага фашызму, адначасова абяцаем узмацніць матар'яльную дапамогу палітзьняволеным, многія тысячы якіх пакутуюць у турмах фашысцкай Польшчы.

Нехай жыве рэвалюцыйнае змаганьне працоўных Зах. Беларусі і Зах. Украіны!

Нехай жыве камуністычная партыя Польшчы!

Нехай жыве сусьветны Кастрычнік!

Лёйд-Джордж едзе ў СССР

ЛЁНДАН, 18. Газэта «Нью Кронікль» паведамляе, што Лёйд-Джорджа, магчыма, яхаць у СССР у верасьні. Газэта піша: «Лёйд-Джордж вельмі цікавіцца пяцігодовым планам і жадае асабіста азнаёміцца з яго результатамі і правядзеньнем у жыцьцё». (ТАСС).

Баявыя дэманстрацыі беспрацоўных у Вільні

ВІЛЬНЯ, 16-га красавіка. Учора ў Вільні адбыліся вострыя дэманстрацыі беспрацоўных. Вялікі натоўп беспрацоўных сабраўся каля магістрацкай сталоўнай на Францішканскай вуліцы. Беспрацоўныя патрабавалі выдачы ім дармовых абедаў. Прадстаўнікі магістрату адказалі, што ў іх няма нічога для выдачы сабраўшымся беспрацоўным. Беспрацоўныя тады ўсёй масай рынуліся на сталоўку і самавольна падаялілі абеды і прадукты, якія былі там. Дэманстранты зьбілі прадстаўнікоў магістрату. Праз некаторы час прыбыў узмоцнены атрад паліцыі, які разагнаў беспрацоўных.

ВІЛЬНЯ, 17-га красавіка. Сёньня зноў паўтарыліся бурныя выступленьні беспрацоўных у Вільні. Беспрацоўныя зноў самавольна ўварваліся ў памяшканьні магістрацкай сталовай. Паліцыя сёньня была падрыхтавана загадзя разагнала дэманстрацыю беспрацоўных. Беспрацоўныя, сабраўшыся на вуліцу, наладзілі новую дэманстрацыю і рушыліся ў кірунку Троцкай вуліцы. Дэманстранты выгукваілі рэвалюцыйныя лёзунгі і патрабавалі неадкладнай дзяржаўнай дапамогі беспрацоўным. Гэтыя выступленьні паказваюць на рост рэвалюцыйных баявых настрояў сярод беспрацоўных Вільні.

Масавыя арышты ў Вільні

ВІЛЬНЯ, 18-га красавіка. Як паведамляюць усе віленскія газэты, ноччу з 17 на 18 красавіка па ўсёй Вільні адбыліся масавыя арышты рабочых. Арышты знаходзяцца ў сувязі з набліжэньнем 1-га мая. Праведзены масавыя аблавы. «Слова» піша, што арыштавана ЗВЫШ 30 ЧАЛАВЕК. Арыштаваным прад'яўляецца абвінавачваньне ў вядзеньні камуністычнай агітацыі.

Рэвалюцыйныя выступленьні навабранцаў

ВІЛЬНЯ, 18-га красавіка. У Польшчы ідзе зараз прызыў у армію 1910 г. У сувязі з прызывам адбываюцца ў розных мясцох рэвалюцыйныя выступленьні навабранцаў. Апошнія дні ў Вільні прыбываюць партыі рэкрутаў. Газэты паведамляюць, што мясцовыя ўлады і паліцыя хутка ліквідуюць розныя «вулічныя авантуры» навабранцаў. «Слова» піша: «у мэтах устанаўленьня спакою паліцэйскія ўлады выдалі неабходныя загады».

„Трэба вымесьці сі старонак нашых газэт усё тое сьмецьце, якое завецца інфармацыяй аб СССР“— заяўляе „Газэта Варшаўска“

ВАРШАВА. Орган эндэкаў «Газэта Варшаўска» публікуе пад загалоўкам «Трэба ведаць праўду» артыкул, прысьвечаны выкананьню савецкай пяцігодкі. Газэта пакажае, што прамысловасьць Захоўнай Эўропы і Амэрыкі будавалася анархічна, у той час, як вопытная думкай савецкай пяцігодкі зьяўляецца рацыянальная пятнамернасьць. «Усе, хто бачыў уласныя вачыма сучасную Расію, — піша газэта, — выходзяцца на тым, што яна ўступіла на шлях шырокага эканамічнага разьвіцьця».

Далей, газэта адзначае, што для Польшчы больш, чым для кагось-б там ні было, важна ведаць, што адбываецца ў СССР. «Усё, што зьмяшчае наш друк аб жыцьці ў Расіі, — адзначае газэта, — не адпавядае самым скромным патрабаваньням. Ніхто на моска заплюшчаць вачэй на тое, што Расія варочаецца да ролі сусьветнага эканамічнага фактара. Неабходна вымесьці ўсё тое інфармацыйнае сьмецьце, якое ўсё яшчэ зьяўляецца на старонках нашых газэт».

Разлажэньне ў радох ППС

ВАРШАВА. Разлажэньне ў кіруючых колах сацыял-фашысцкага пепэсаўскага лягеру, якое адбываецца ў формах асабістай сяпоні, узаемных абвінавачваньняў у апоўжыцьцяньнях і г. д., прывяло да новага раколу ў подзямнай арганізацыі ППС. Раскол выклікан старшынёй мясцовага акружовага камітэту і віцэ-прэзыдэнтам гораду, Вялінскім, які зьяўляецца членам ЦК партыі і які належыць да ППС 33 гады. Вялінскі, ня гледзячы на пастанову акружовага камітэту ППС, не пакінуў пасты віцэ-прэзыдэнта.

Гэтымі днямі пэпэсаўскі «Робочнік» паведамляў аб расколе ў варшаўскай арганізацыі ППС, са складу якой выйшаў былы сакратар варшаўскага камітэту Заваднік і былы сакратар прафсаюзу рабочых і служачых камунальных устаноў Высоцкі. Абодва яны далучыліся да групы Мараеўскага, якая адкалолася ад ППС, прабуючы шры гэтым прыцягнуць на свой бок варшаўскае аддзяленьне прафсаюзу камунальнікаў.

Лічаць, што выход Завадзкага і Высоцкага зьяўляецца пачаткам далейшых расколаў.

Гэраічная барацьба сьвіслацкіх гарбароў

На працягу ўжо трох месяцаў вядуць сьвіслацкія гарбары ўпартую забастовачную барацьбу супроць 33-процэнтнага зьніжэньня зарплаты, якое абясьцілі капіталісты.

Орган польскага сацыял-фашызму «Роботнік» 16-га красавіка падае жахлівыя даныя аб становішчы сьвіслацкіх гарбароў.

Найвышэйшая стаўка зарплаты вызначаецца ў 7 злотых (каля 1 руб. 30 кап. на нашы грошы). Але рабочым атрымліваюць гатоўкаю толькі палову, за што фабрыканты адлічваюць ў іх 10 проц.; другая палова выплачваецца «квіткамі», за якія ў крамах, або ў ліхвароў рабочыя атрымліваюць толькі 25 проц. вартасьці.

Каб зламаць забастовачную барацьбу, якую ўпарта вядуць рабочыя, фабрыканты набіраюць на працу з ваколічных вёсак сялян, якіх эксплёатуюць самым зьверскім чынам. Працуюць яны па 20 гадзін, атрымліваючы 40 грошай у гадзіну (каля 8 кап.). Але і гэтую жабрацкую зарплату фабрыканты выплачваюць ім у вэкселёх праз 6 месяцаў.

Шырокія пляны польскага імпэрыялізму

БЭРЛІН. «Берлінэр берзэнцайтунг» піша, што паездка грэцкага прэм'ера Венізэлоса ў Варшаве, Белград, Вену, Будапэшт і Рым, якая адбылася 3-4 месяцы таму назад, стала ў цеснай сувязі з ажыцьцяўленьнем новых грандыёзных планаў польскага імпэрыялізму. Пляны гэты, у асноўным, заключаецца ў прадоўжаньні чыгуначнай лініі Гдыня—Верхняя Сілезія на поўдзень да Чорнага і Міжземнага мораў. Гэтыя зносіны з поўднем павінны пайсьці па двух лініях. Першая пойдзе праз Будапэшт, а адтуль да Югаславскага ўзьбярэжжа Міжземнага мора. Другая лінія пойдзе праз Румынію, адтуль адна ветка зьявіцца Польшчу з румынскімі чарнаморскімі партамі — Галацом, Капстанцай і пройдзе ў Салонікі, а другая пойдзе праз Бэсгарабію (Рушчук і Сафію) у Канстантынопаль. «Берлінэр цайтунг» указвае пто гэты плян падтрымліваецца Францыяй і што ў час прабываньня Венізэлоса ў Варшаве там была заключана згода, паводле якой частка Салонікскай гавані будзе абярнута ў польскую вольную гавань. Газэта далей адзначае, што плян Польшчы мае падвойнае значэньне. Па-першае, гэта чыгунка адкрые рынак збыту польскай прамысловасьці ў паўднёва-ўсходняй Эўропе і ў Малой Азіі. Па-другое,—і гэта галоўнае—плян мае вялікае стратэгічнае значэньне, бо праз Салонікскую гавань для Польшчы будзе забясьпечана сувязь з Францыяй. (ТАСС).

БАЯВАЯ ПАДРЫХТОЎКА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ДА 1-га МАЯ У КРАЁХ КАПІТАЛУ

НЬЮ-ЁРК. Камуністычная партыя, рэвалюцыйныя прафсаюзы і камітэты беспрацоўных вядуць узмоцненую падрыхтоўку да правядзеньня першамайскай дэманстрацыі. У Нью-Ёрку адбыліся канфэрэнцыі рэвалюцыйных арганізацый, у якой прымалі ўдзел 471 дэлегат. Канфэрэнцыя выцясьніла адзіную, у якой заклікае ўсіх рабочых прыняць удзел у дэманстрацыі 1-га мая пад лёзунгамі: «Проч беспрацоўе, супроць зьмяншэньня зарплаты, проч лінчаваньне неграў, проч падрыхтоўку да імпэрыялістычнай вайны, накіраванай у першую чаргу супроць СССР».

Каб папярэдзіць рэвалюцыйныя дэманстрацыі 1-га мая, фашысцкая арганізацыя былых удзельнікаў сусьветнай вайны і сацыялістычная партыя зьвярнуліся да паліцыі з гарадзкім прадстаўніцтвам 1-га мая Юніён Сквэр (плошча у Нью-Ёрку, традыцыйнае месца дэманстрацый рэвалюцыйных рабочых).

У адказе рэвалюцыйным арганізацыям гаворыцца, што спрэнні фашыстаў і сацыял-фашысты зьяўляюцца простай правакацыяй, накіраванай супроць рабочых Нью-Ёрку, якія ня працуюць дзесяткаў год домагаюцца 1-га мая та Юніён-Сквэр. Рабочы Нью-Ёрку заклікаюць абараняць свае права на правядзеньне дэманстрацыі 1-га мая.

ВЫБІРАЮЦЦА РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ КАМІТЭТЫ

НЬЮ-ЁРК, 18. Па ўсёй краіне вядзецца падрыхтоўка да першамайскіх дэманстрацый. Выбіраюцца камітэты рэвалюцыйных рабочых арганізацый. У Філядэльфіі была праведзена дэманстрацыя 6.000 рабочых.

Шматлікія рабочыя сходы ў Бэрліне

БЭРЛІН, 16. Фронт падрыхтоўкі да балявых першамайскіх выступленьняў у Нямеччыне пад лёзунгамі кампаніі і рэвалюцыйнай прафсаюзыцы пашыраецца з асаблівым днём. У Бэрліне ся апошнія дні адбыліся шматлікія сходы рабочых, у асаблівасьці ў металяпрамысловасьці, і на транспартных прадпрыемствах, дзе выбраны першамайскія камітэты. Такія-ж камітэты выбраны на шматлікіх сход

ЗЬЕЗДУ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРАЎ

У БОЙ ЗА 13 МІЛЬЁНАЎ!

Рацыяналізацыя ня стала яшчэ баявой зброяй у змаганьні за прамфінплян

У першым квартале рацыяналізатарская работа ішла самацёкам. Плянаў рацыяналізацыі па большасьці аб'яднаньняў няма і на другі квартал

ДЫРЭКТЫВА ПАРТЫІ АБ УЗМАЦНЕНЬНІ РАЦОРГАНАЎ НЯ ВЫКАНАНА

НАША ПУЦЁУКА: склясьці выразныя пляны, давесьці іх да кожнай ударнай брыгады, перабудаваць усю работу на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Партыя і рабочая клясa паставілі перад сабой у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі вельмі адказную задачу — завяршэньне пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне. Гэта задача пасьпяхова ажыцьцяўляецца. На сёньняшні дзень ужо налічваецца рад галін прамысловасьці і паасобных прадпрыемстваў, якія выканалі заданьні пяцігодкі за два з паловай гады. Рад буйнейшых прадпрыемстваў, у тым ліку і БССР, датэрмінова выконваюць свае прамфінпляны, ажыцьцяўляючы лёзунг партыі аб выкананьні пяцігодкі за чатыры і тры гады.

Аднак, у радзе галін прамысловасьці наглядаецца ганебнае адставаньне ад плянавых заданьняў. Прамысловасьць БССР у цэлым выканала праграму першага кварталу 1931 г. на 84,4 проц. Гэты прарыў тлумачыцца ў першую чаргу тым, што гаспадарчыя органы і арганізацыі паасобных прадпрыемстваў ня здолелі стаць на чале актыўнасьці і энтузіязму шырокіх рабочых мас, якія былі выкліканы верасьнёўскай адозвай ЦК УсеКП(б), што гаспадарчыя органы выпусьцілі з пад сваёй увагі такую важнейшую галіну работы, як рацыяналізацыю.

Першы квартал праспалі

Хто-б паверыў, што ў першым квартале 1931 г. прадпрыемствы ніякай рацыяналізатарскай работы не праводзілі і нават ня склалі плянаў рацыяналізацыі на першы квартал? Між тым, гэта факт. Факт, у якім, галоўным чынам, вінаваты прэзыдыум ВСНГБ, які толькі ў пачатку сакавіка зацьвердзіў рацыяналізатарскія пляны на 1931 год, атрыманы ад аб'яднаньняў у сьнежні, студзені і лютым. Работнікі ВСНГ апраўдваюцца тым, што даклад прамфінплян 1931 году позна зацьверджан. Але гэта ня можа служыць апраўданьнем, бо рацыяналізацыя - вытворчасьці павінна праводзіцца незалежна ад зацьвярджэньня таго ці іншага варыянту прамфінпляну і не чакаць гэтага зацьвярджэньня.

Такім чынам, першы квартал прайшоў у чаканьні. Аб'яднаньні чакалі аказу ВСНГ, а прадпрыемствы—аказу аб'яднаньняў. Пляны рацыяналізацыі на першы квартал складзены ня былі.

На другі квартал рацыяналізацыі яшчэ няма

Толькі 7-га сакавіка сэктар рацыяналізацыі ВСНГ патрабаваў ад аб'яднаньняў прадстаўленьня плянаў рацыяналізацыі на... другі квартал 1931 году. Ня гледзячы на тое, што апошні тэрмін быў 25-га сакавіка, ні да гэтага тэрміну, ні да сёньняшняга дня пляны рацыяналізацыі на другі квартал аб'яднаньнямі не прадстаўлены (за выключэньнем запалкавага і паліграфаб'яднаньняў). Некаторыя аб'яднаньні атрымалі такія пляны толькі ад некаторых прадпрыемстваў.

Рабочыя прапановы ня ўключаны

Пляны рацыяналізацыі на 1931 год па радзе аб'яднаньняў (мэталяаб'яднаньне, шклаўнае, скурана - абутковае) складаны аддзеламі рацыяналізацыі без удзелу тэхнічных частак аб'яднаньняў і ня былі разгледжаны кіраўнікамі аб'яднаньняў. У плянах рацыяналізацыі не знайшлі выстарчальнага адпюстраваньня рабочыя прапановы. У плянах не прадугледжаны мерапрыемствы па ўзмацненьні прытоку рабочых прапаноў. Ні адно аб'яднаньне не скарыстала вопыту лепшых прадпрыемстваў саюзу ў справе плянаваньня прытоку рабочых прапаноў.

Шклааб'яднаньне прадставіла пляны рацыяналізацыі, якія паводле заявы самога дырэктара аб'яднаньня, зьяўляецца невыстарчальным. Пляны рацыяналізацыі запалкавага аб'яднаньня і хэмічнага аб'яднаньня складзены выключна за кошт капітальных укладаньняў, што сьведчыць аб ігнараваньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па палепшэньні тэхналёгічных працэсаў, па скарыстаньні адходаў і адкідаў, па рацыяналізацыі кіраўніцтва і г. д. У плянах рацыяналізацыі ня ўключаны мерапрыемствы па эканоміі спаду на 15 проц., згодна апошніх дырэктыў ураду. Зусім мала мерапрыемстваў вызначана для палепшэньня якасьці прадукцыі.

Замест узмацненьня рацорганаў—паслабленьне

Усё гэта зьяўляецца вынікам недаацэнкі значэньня рацыяналізацыі ў справе пасьпяховага выкананьня прамфінплянаў. Гэта недаацэнка ў першую чаргу адбіваецца на стварэньні саміх рацыяналізатарскіх органаў. Як гледзячы па верасьнёўскую дырэктыву ЦКК УсеКП(б)—«у месячны тэрмін, пад асабістую адказнасьць кіраўніку гаспадарчых органаў, закончыць укамплектаваньне ўсёй сыстэмы рацыяналізатарскіх органаў найбольш кваліфікаванымі работнікамі, ня спыняючыся перад перавядам на рацыяналізатарскую работу найбольш зарэкамендаваўшых сябе вядомых рацыйных работнікаў», органы рацыяналізацыі ня толькі ня ўкамплектаваны, але ёсьць рад выпадкаў, калі рацыяналізатары пераводзяцца на іншую работу. Так, на «Чырвоным мэтапісьце» з двух рабочых, якія скончылі курсы рацыяналізатараў у Ленінградзе, адзін быў пераведзены на партработу. На заводзе «Энэргія» з двух рабочых, якія скончылі менскія курсы рацыяналізатараў, адзін быў назначэн загадчыкам аддзелу тэхнічнага кантролю, а другі накіраваны на завод «Ударнік» на пасаду майстра ліцейнага цэху. Завод «Бальшавік» у мінулым годзе паслаў на рацкурсы 4-х рабочых: адзін скарыстаны пасьля курсаў на партрабоце, другі пасланы дырэктарам, трэці—на гаспадарчую работу і толькі апошні застаўся рацыяналізатарам. На гуце «Прапетары» рацыяналізатара камандыравалі на тры месяцы для закупкі шкла. Такіх фактаў шмат.

Рад аб'яднаньняў (запалкавае, хэмічнае, паліграф) зусім ня маюць рацыяналізатараў. У такім-жа становішчы і некаторыя прадпрыемствы, напрыклад, панчошна - трыкатажная фабрыка ў Віцебску.

Ня гледзячы на такое напружанае становішча з кадрамі рацыяналізатараў амаль нічога ня робіцца для выхаваньня гэтых кадраў.

З уліком—горш быць ня можа

Асобна трэба спыніцца на ўліку работы па рацыяналізацыі. З уліком справа стаіць так кепска, што тут патрэбны нейкія надзвычай энэргічныя меры, каб у гэту справу ўнесьці порадок. Некалькі фактаў адлюструюць усю сур'ёзнасьць прарыву ў гэтым напрамку. Даводзі сказаць, што ВСНГБ ня падае, як прамысловасьць выканала пляны рацыяналізацыі 1929-30 г. і асобнага кварталу. За выключэньнем менскай кальсон. Рэпніцкага і інш.), правяўшых і імя Варашылава і фабрыкі «Кастрычнік», ні адно прадпрыемства БССР не прадставіла вестак аб выкананьні рацыяналізатарскага пляну асобнага кварталу. ВСНГБ вінаваціць у гэтым аб'яднаньне, а апошняе — заводакіраўніцтвы. Вінаваты, зразумела, усе разам, а асабліва ВСНГБ, які ня прымае энэргічных мер для наладжаньня ўліку работы і справаздачнасьці. Ёсьць досыць выразная дырэктыва ЦК УсеКП(б) ад 4-га верасьня 1930 г.: «ва ўсіх выпадках невыкананьня дырэктыў па рацыяналізацыі накладаць строгія спагнаньні на вінаватых аж да зьняцьця з работы. УСЯКАЕ СУПРОЦЬДЗЕЙНІЧАНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ РАЗГЛЯДАЦЬ, ЯК ШКОДНІЦТВА З УСІМІ ВЫПЛЫВАЮЧЫМІ АДСЮЛЬ ВЫНІКАМІ». Гэту дырэктыву трэба ўжыць поўнасьцю да тых, хто зрывае ўлік рацыяналізатарскай работы і выкананьне рацыяналізатарскіх плянаў.

Задачы зьезду рацыяналізатараў

Сёньня адкрываецца ўсебеларускі зьезд рацыяналізатараў і вынаходцаў. Гэта, здаецца, першы падобны зьезд ня толькі ў нас у БССР, але і ў Савецкім Саюзе. Перад дэлегатамі зьезду стаіць адказьнейшая задача — распрацаваць рад мерапрыемстваў для таго, каб дабіцца неадкладнага пералому ў рацыяналізатарскай справе і забясьпечыць поўнае выкананьне і перавыкананьне рацыяналізатарскіх плянаў.

Трэба цьвёрда памятаць, што зацьверджаны прэзыдыумам ВСНГБ рацыяналізатарскі плян па прамысловасьці зьяўляецца мінімальным. Пры затраце ў 1.548 тысяч рублёў плян рацыяналізацыі павінен даць 8,8 мільёнаў руб. эканоміі. Аднак, гэта сума складае толькі 40,2 проц. усёй сумы зьніжэньня сабекошту, у той час, калі, згодна вышэйшых дырэктыў, гэты процант павінен быць ня менш 60-70 (г. зн. эканомія павінна скласьці звыш 13.000.000 руб.).

Значыць зьезду рацыяналізатараў прыдзецца распрацаваць такія мерапрыемствы, якія-б стварылі ўсе ўмовы ня толькі для выкананьня зацьверджаных рацыяналізатарскіх плянаў, але і для прытоку новых сотень і тысяч рабочых прапаноў і большага разгортваньня рацыяналізатарскай работы ў кожным цэху, у кожнай брыгадзе.

Наша пуцёўка

Выходзячы з усіх адказных задач, якія стаяць перад нашай прамысловасьцю ў справе рацыяналізацыі, «Зьвязда» высоўвае перад зьездам рацыяналізатараў наступную ПУЦЁЎКУ:

1) Распрацаваць рад мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі яшчэ ў другім квартале трэцяга году пяцігодкі выкананьне асноўных рацыяналізатарскіх прапаноў.

2) Удакладніць рацыяналізатарскія пляны І ДАВЕСЬЦІ ІХ ДА КОЖНАЙ УДАРНАЙ БРЫГАДЫ.

3) Праверыць выкананьне плянаў рацыяналізацыі, выходзячы з вызначаных каляндарных тэрмінаў.

4) Распрацаваць мерапрыемствы для ўстанаўленьня выразнага ўліку ўсёй рацыяналізатарскай работы і выкананьня рацпляну.

5) Разгарнуць на прадпрыемствах НОВЫ ЗБОР РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, неадкладна праверыўшы выкананьне ўжо ўнесеных прапаноў.

6) У кожным цэху, у кожнай ударнай брыгадзе стварыць рацыяналізатарскія ячэйкі.

7) Усю рацыяналізатарскую работу ПЕРАВЕСЬЦІ НА РЭЙКІ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА шляхам заключэньня індывідуальных і калектыўных сацдагавораў.

8) Абавязаць усе рацыяналізатарскія органы стаць падпісчыкамі «СА», а ўсіх рацыяналізатараў — карэспандэнтамі «СА».

9) Паставіць на належную вышыню плянаваньне рацыяналізатарскай работы шляхам складаньня РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ТЭМНІКАЎ, шляхам вывучэньня вузкіх месц вытворчасьці, узмацненьня тэхнічнай вучобы і г. д.

10) Дабіцца арганізацыі на ўсіх прадпрыемствах ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНЫХ БРЫГАД, або майстэрань для выкананьня рацыяналізатарскіх прапаноў.

Гэтыя некалькі прапаноў, зразумела, ня вычэрпваюць усіх адказных задач, якія стаяць перад зьездам рацыяналізатараў. Мы спадзяемся, што зьезд рацыяналізатараў дапоўніць гэтыя прапановы новымі дзесяткамі мерапрыемстваў, якія сапраўды забясьпечаць поўнае выкананьне і перавыкананьне рацыяналізатарскіх плянаў і ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі—«Пяцігодка—за чатыры і тры гады».

СЁНЬНЯ КАНЧАЕЦЦА ТЭРМІН,

а дагаворная кампанія да заводаў не дакацілася

Кіраўнікі ў разьездах

ДАГАВОРНАЯ У БЕЛДЗЯРЖСНАБЕ ІДЗЕ САМАЦЁКАМ

Паводле катэгарычных дырэктыў ВСНГ Саюзу і БССР, заключэньне дагавораў павінна быць скончана да 20 красавіка г. г., а ў Белдзяржснабе ня толькі канца ня відаць дагаворнай кампаніі, але і пачатку талковага няма. Прычыны гэтаму, на нашай думцы, ляжаць у няправільным кіраўніцтве гэтай кампаніяй.

Кіраўніцтва Белдзяржснабу «ўмыла рукі» і стала ў баку ад непасрэднага заключэньня дагавораў. Факты наступныя:

Тав. Луцкевіч выехаў у Маскву для высьвятленьня раду прынцыповых і практычных пытаньняў, хаця паездка магла быць адкладзена да скончэньня заключэньня хаця-б генэральных дагавораў.

Тав. Гарэлік (начальнік фін. плян. сэктару) даўно ўжо ў Маскве, дзе таксама «высьвятляе» рад пытаньняў.

На чарзе стаіць шмат надзвычай складаных і адказных фінансавых пытаньняў. Усім вядома, што ў наяўнасьці пагладзецца амаль поўная закупорка ўсіх апэрацый Белдзяржснабу з-за адсутнасьці ліміту—тавары новыя не паступаюць на склады, а тыя, якія ёсьць, не адпраўляюцца пакупцом, бо ў большасьці на іх таксама няма ліміту.

Тав. Гарэлік пазнім быў тэрмінова і не пазьней 7-IV г. г. быць у Менску, г. зн. пасьля таго, як стала вядома, што часова дагаворы можна заключаць без пакаяньня колькасьці і прыняць самы актыўны ўдзел у заключэньні дагавораў і вырашэньні раду фінансавых пытаньняў пры падпісаньні іх.

Толькі 13 красавіка адміністрацыя Белдзяржснабу выдала загад аб арганізацыі камісіі па заключэньні дагавораў, а да гэтага-ж часу былі толькі адны гутаркі.

Цікава адзначыць, што ў склад гэтай камісіі не ўвайшлі па нязадомых нам прычынах, самыя галоўныя работнікі апэрацыйнага сэктару.

Апрача таго ў гэтай камісіі, дый погуля у Белдзяржснабе, няма адказнай асобы за спрачэсваё і выразнае правядзеньне дагаворнай кампаніі. Трэба таксама адзначыць, што і склад камісіі няўдалы.

Ні гэтэйка, ні мяцюком пякнага ўдзелу ў гэтай адказнай кампаніі ня прымалі і ня прымаюць.

Свой.

РАБОЧЫЯ МАСЫ НЕ МАБІЛІЗАВАНЫ ВАКОЛ КРЭДЫТНАЙ РЭФОРМЫ, ВЫКАРЧАВАЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНЫ САМАЦЁК, ВЫПРАВІЦЬ НА-ХАДУ ПАМЫЛКІ, НЕАДКЛАДНА СКОНЧЫЦЬ ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ ДАГАВАРОЎ

ЗВОДКА

аб ходзе дагаворнай кампаніі

(ПАВОДЛЕ ДАНЫХ ВСНГ БССР)

За апошні час у працы аб'яднаньняў намецілося некаторы пералом. Значную ролю ў гэтай працы атрымала створаная ў ВСНГ БССР камісія па праверцы ходу заключэньня дагавораў. Праз камісію прайшоў рад аб'яднаньняў, па працы якіх камісіяй прыняты належныя пастановы і даны адпаведныя паказаньні.

Трэба адзначыць, што ДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ У АСНОЎНЫМ ПРАХОДЗІЛА ПА АБ'ЯДНАНЬНЯХ, НЕ ЗАКРАНАЮЧЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, але-ж у апошні час прадпрыемствы таксама пачалі ўключацца ў гэту кампанію.

ПА МЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНІ — заключаны дагаворы на забесьпячэньне з Усехэмпромам на серкавую кіслату і бісульфат, Мэтэзаб'яднаньнем — на дрот, Будаб'яднаньнем — на цэглу, аформляецца дагавор з філіялам «Стальзбыту» — на мэталі; на збыт заключаны дагаворы з трэстам «Тэхніка бясьпечнасьці», на ахоўныя акуляры з віцебскай акулярнай ф-кай, з Масгандлем—на прадукцыю Іголкавай ф-кі—Іголкі.

ПА ХЭМАБ'ЯДНАНЬНІ — заключаны гэнзгоды з Усехэмпромам на забесьпячэньне цэлюлёідам і смоламі, з Охцінскім заводам пёкальных дагавор на цэлюлёід заключан ф-кай «Беларуска», заводам «Чырвоны хэмік» заключан прадметны дагавор на забесьпячэньне вапнавым туфам. Накіраван праект гэнзгоды ў Саюзсьпірт на забесьпячэньне сьпіртам лакафарбавальнага заводу. Заключаецца дагавор на агульнае забесьпячэньне з Белснабам.

Па збыце: заключана гэнзгода на пака-папіўуру і фарбу з Усехэмпромам, пёкальны дагавор заключан толькі на фарбу. Уся прадукцыя гапянтарэйнай ф-кі «Беларуска» ахоплена прадметнымі дагаворамі. На фасфарыты заключана гэнзгода з акц. таварыствам «Мінэралаўгнаеньне». На крэйду крычаўскую заключана гэнзгода з Белдзяржснабам і на хэмічную з «ОМПК».

Камісія прапанавала Хэмаб'яднаньню правесьці працу па безвкладным ахапленьні дагаворамі прадпрыемстваў на падставе гэнзгод.

ПА ШКЛААБ'ЯДНАНЬНІ — заключэньне дагавораў затрымліваецца ў галіне забесьпячэньня Усехэмпромам. Па забесьпячэньні заключан дагавор на пастаўку шклабою з Белуціпем.

Па торфе заключаны прадметныя дагаворы заводамі «Камінтэрн» і «Труды» з торфазаводамі.

Па збыце заключана гэнзгода з Саюзшклапафарфарам, пёкальныя дагаворы з прадпрыемствамі афармляюцца.

Камісіяй адзначана ВЕЛЬМІ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ СТАНОВІШЧА З ЗАКЛЮЧЭНЬНЕМ ДАГАВАРОЎ ПА ШКЛААБ'ЯДНАНЬНІ. Прапанавана на працягу 48 гадзін аформіць дагаворамі свае адносіны з Белснабам, Белторфам, Лесбелам і Усехэмпромам.

ПА СКУРАБ'ЯДНАНЬНІ — работа па заключэньні дагавораў ня можа лічыцца здавальняючай. Толькі на 17 г. м. была склікана нарада дырэктараў заводаў па пытаньнях заключэньня дагавораў. Згодна паведамленьня прадстаўніка белканторы «Саюзкур» тав. Загорчыка дагаворанасьць паміж прадпрыемствамі на забесьпячэньне бёсьць і дагаворы будуць аформлены 20 красавіка.

ПА ШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНІ — заключаны дагаворы на забесьпячэньне з Белснабам, Белторфам, Будаб'яднаньнем і на збыт з Белкавапсаюзам. Заключан дагавор на перавозкі з Саюзтрансам.

ПА ТОРФААБ'ЯДНАНЬНІ—заключан рад дагавораў як па забесьпячэньні, так і па збыце. Па забесьпячэньні з Белдзяржснабам, філіялам «Стальзбыт»; па збыце з Белбудаб'яднаньнем, Белпаперай, Запалкааб'яднаньнем, Хэмаб'яднаньнем і Швэйаб'яднаньнем.

ПА ПАЛІГРАФАБ'ЯДНАНЬНІ — прахадзэньне дагаворнай кампаніі ў параўнаньні з іншымі аб'яднаньнямі можна лічыцца здавальняючым. Па збыце заключана гэнзгода з Белдзяржвыдавецтвам, шпаперный ф-кай заключан прадметны дагавор на збыт з Белдзяржснабам. Заключаны дагаворы на збыт друкарням імя Сталіна і Палесдрукам. На забесьпячэньне афармляюцца дагаворы з Паліграфснабам і Саюзпаперай.

ПА ЗАПАЛКААБ'ЯДНАНЬНІ — становішча заключэньня дагавораў ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ, да гэтага часу па забесьпячэньні дагавораў зусім няма. Аб'яднаньне абмежавалася пасылкай праектаў дагавораў дастаўшчыкам. Стварылася рэальная пагроза зрыву дагаворнай кампаніі.

ПА ЛЕСБЕЛЕ — правядзеньне дагаворнай кампаніі таксама НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Толькі нязначная частка збыту ахоплена дагаворамі. Таксама стварылася рэальная пагроза зрыву дагаворнай кампаніі.

ПА БЕЛСНАБЕ — за апошнія часы праца па заключэньні дагавораў разгарнулася. Аднак, трэба адзначыць, што з боку Белснабу наглядаецца няўхільная тэндэнцыя да самастрахоўкі шляхам уключэньня адпаведных пунктаў у праекты дагавораў. Камісія прапанавала Белснабу выкрэсьліць ад такіх пунктаў, і ўнесьці дадатак аб адказнасьці за невыкананьне дагавораў.

Аднак, ня гледзячы на гэта, Белснаб імкнецца ўнесьці і гэтыя пункты ў дагаворы і рад яго кантрагентаў зварачаўся да сэктару забесьпячэньня і збыту ВСНГ БССР за неабходнай дапамогай і тлумачэньнямі. Такія выпадкі толькі перашкаджаюць правядзеньню дагаворнай кампаніі.

Адказы ВСНГБ

на пытаньні, якія былі заданы на інструкцыйнай нарадзе пры „Зьвязьдзе" па дагаворнай кампаніі і крэдытнай рэформе*)

9. Пытаньне: а кім павінны заключаць дагаворы прадпрыемствы, якія праходзяць толькі рамонт?

АДКАЗ: калі прадпрыемства зьвязана па правядзеньні рамонту з кім-небудзь значным і пастаянным заказчыкам, дык трэба з ім заключыць абавязкова дагавор падраду, а калі заказчык выпадковы, заказ назначны, дык заключэньне дагавору зьяўляецца неабавязковым, а ва ўсіх гэтых выпадках трэба абменьвацца паміж сабою пісьмовым заказам, у якім павінны быць паказаны асноўныя моманты: тэрмін выкананьня, характар работы, гарантыі і г. д. і пісьмовым пацьвярджэньнем з боку прадпрыемства падрадчыка гэтага заказу.

10. Пытаньне: калі заключан дагавор падраду на будаўніцтва з матар'ялаў работадаўцы, дык хто павінен заключаць дагавор на будаўнічыя матар'ялы — работадаўца ці будаўнічая арганізацыя?

АДКАЗ: па гэтым пытаньні глядзеце растлумачэньне ВСНГ СССР (газэта «За индустриализацию» ад 14-IV 31 г.) Дагавор на будаўнічыя матар'ялы павінен быць заключан падрадчыкам, а фонды на будаўнічыя матар'ялы павінны быць перададзены падрадчыку работадаўцам.

11. Пытаньне: а кім павінна прамысловасьць заключаць дагаворы на паставку сельгасспырцу (бульба, лён і г. д.)?

АДКАЗ: генэральныя згоды павінны быць заключаны паміж адпаведным прамысловым аб'яднаньнем і адпаведным галінавым аб'яднаньнем Наркамснабу ці Белкавапсаюзам, магчыма з тым і іншым.

У гэтых генэральных згодах павінна быць паказана, якія заводы — спажыўцы, да якіх рабочых органаў пастаўшчыкоў прымацоўваюцца, і яны павінны заключыць паміж сабой пёкальныя дагаворы.

12. Пытаньне: як павінны аплачвацца дробныя рахункі для іншагародніх спажыўцоў па транзітных пастаўках?

АДКАЗ: для аплаты дробных іншагародніх рахункаў дазволена ўмыванне адпаведных чыгуначных наложаных плацяжоў або паштовых пераводаў.

13. Пытаньне: ці можна заключаці дагаворы ў той час, калі Дзяржплан яшчэ не разьмеркаваў, напрыклад, будаўнічых матар'ялаў і не ўстанавіў перашчарговасьці будаўніцтва?

АДКАЗ: дагаворы павінны заключацца і ў выпадках, калі да моманту заключэньня яшчэ няма цьвёрда вызначаных фондаў. У гэтых выпадках колькасьць пастаўкі паказваецца арыентавочна з агаворкай, што колькасьць пастаўкі падлягае пакварталпаму ўдасканаленьню ў адпаведнасьці з вызначанымі фондамі.

Адносна першачарговасьці забесьпячэньня будаўніцтва будаўнічымі матар'яламі адпаведная агаворка павінна быць таксама зроблена аб тым, што тэрміны пастаўкі будуць удасканалены ў адпаведнасьці з пастановай Дзяржплану, у якой будзе ўстаноўлена чарговасьць гэтага будаўніцтва.

*) Пачатак гляді ў «Зьвязьдзе», № 105.

Сустрэчнымі павышанымі нормамі адкажам на заклік тульскіх рабочых

Перагляд норм выпрацоўкі і расцэнак перакварыць у баявую масавую кампанію барацьбы за прамфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі

Кампанія разгортваецца недапушчальна марудна, без растлумачальнай работы, бяз удзелу перадавых рабочых. На Гомельскай ф-цы "Праца" яшчэ не прыступілі да гэтай кампаніі.

Устанаўленьнем правільных норм выпрацоўкі ўдарым па „ўраўнілаўцы" ў аплаце працы. Ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і рабочых прапаноў—аснова тэхнічнага нармаваньня.

Выкананьне гаспадарчага пляну бягучага году па ўсіх паказальніках патрабуе выключнай увагі да пытаньняў прадукцыйнасьці працы. Вызначанае плянам павышэньне прадукцыйнасьці працы па прамысловасьці ВСНГБ на 33 проц. вусім рэальнае. Яно вынікае са значнага павялічэньня і палепшэньня тэхнічнага абсталяваньня, правядзеньня раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, магутнага росту сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Вынікі першага кварталу характарызуюцца далейшым разгортваньнем прамысловасьці. Выпуск валавой прадукцыі складае 142,2 проц. у параўнаньні з адпаведным перыядам мінулага году. Аднак, прадукцыйнасьць працы па раздзе прадпрыемстваў адстае ў параўнаньні з асобным кварталам.

Па прамысловасьці ВСНГБ за 2 месяцы першага кварталу супроць асобнага кварталу прадукцыйнасьць на аднаго рабочага ў дзень складае 97,4 проц., а зарплата—98,6 проц. характарным зьяўляецца лічбы па асобных прадпрыемствах: па віцебскай гарбарні выпрацоўка на аднаго рабочага ў дзень складала ў асобным квартале 45 руб. 04 кап., а ў першым квартале гэтага году — 43 руб. 84 кап., зарплата-ж у дзень выраслa з 4 руб. 02 кап. у асобным квартале да 4 руб. 09 кап. —у студзені і лютым месяцах. Па гомельскай абутковай фабрыцы выпрацоўка прадукцыі на аднаго рабочага ў дзень складала ў асобным квартале 26 руб. 68 кап., а ў першым квартале бягучага году — 26 руб. зарплата за першыя 2 месяцы — 4 руб. 38 кап. у дзень супроць 3 руб. 05 кап. — у асобным квартале.

Адной з важнейшых прычын прарыву па прадукцыйнасьці працы зьяўляецца адставаньне існуючых норм выпрацоўкі ад росту тэхнічнай узброенасьці новых прадпрыемстваў. Ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў не знайшло належнага адбітку ў большасьці існуючых норм выпрацоўкі. Таму ўсім ясна, што сваячасовы перагляд норм у адпаведнасьці з тэхнічнымі магчымасьцямі кожнага прадпрыемства, кожнага варштату набывае выключнае гаспадарчае значэньне для пасьпяховага выкананьня гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году.

На жаль, па многіх прадпрыемствах кампанія разгортваецца недапушчальна марудна, без выстарчальнай мабілізацыі рабочых мас.

Марудна, мэханічна, габінэтна праходзіць перагляд норм

Возьмем, напрыклад, адно з лепшых прадпрыемстваў — завод «Камунар», — якое з посьпехам скончыла другі год пяцігодкі і з ня меншымі дасягненьнямі ўступіла ў трэці рашаючы год. Перагляд норм на гэтым заводзе праходзіць надзвычай марудна, мэханічна, у габінэтах. Уся работа па перагляду складзена на ТНБ, вакол якога не арганізаван актыў з перадавых рабочых. Прафарганізацыі стаяць у баку ад гэтай работы. Пытаньне перагляду норм было абгаворана на бюро партколектыву, па сходах 2-х цэхавых парт'ячэек і камсамольская ячэйка. Па гэтым і была скончана ўся масавая работа. На агульных сходах пытаньне перагляду норм не разглядалася.

Ня гледзячы на слабую масавую работу кіраўніцтва заводзкіх арганізацый асобныя перадавыя рабочыя высоўваюць сустрэчныя павышаныя нормы. Брыгада ў бляшаным цэху (тав. Фінкельсон, Рэпніцкі і інш.), правяўшы спрашчэньне работы, высунула сустрэчныя нормы павышаныя на 5 проц. супроць норм, якія былі зацьверджаны. Т. т. Карабанаў і Бельскі далі сустрэчныя павышаныя нормы на 10 проц. Сустрэчныя нормы па абточцы дасягнулі гонтарэзкі далі магчымасьць зрабіць больш таннай кошт абточкі з 7 руб. да 6 руб. Пры апрацоўцы ТНБ разам з брыгадай норм на зборцы гонтарэзак, удалося шляхам рацыяналізацыі і спрашчэньня работы павысіць нормы і патаніць кошт зборкі з 51 да 40 рублёў.

Аднак, трэба адзначыць, што вытворчы энтузіязм і ініцыятыва рабочых сваячасова не падхапляюцца заводзкімі арганізацыямі. Калі тарнік Гольдфарб, які працуе на вальцоўцы і рыхтоўцы варонак, павысіў сваю норму на 25 проц. і выкрыў асобных рвачоў, дык яго зараз ня прымаюць у брыгаду, якая лічыць, што нельга павышаць нормы больш, чым на 11 проц. Гэта ў той час, калі ўстаноўленая норма ў 650 фактычна перапрацоўваецца, дасягаючы ўжо зараз больш 1.000. Заўком павуль што ня выступіў супроць гэтага ганебнага факту прасьледаваньня перадавіка ўдарніка, не абгаварыў гэтага пытаньня, ня ўзьняў яго на прынцыповую вышыню, на ўроках гэтай справы не маблізаваў рабочай грамадзкасьці на сапраўднае павышэньне прадукцыйнасьці працы.

Прыведзеная практыка заводу «Камунар» не зьяўляецца выключэньнем. На абутковай фабрыцы «Праца» (Гомель), якая робіць, галоўным чынам, чаравікі замест ботаў, дзе перагляд норм набывае асаблівае значэньне, заводзкімі арганізацыямі да апошняга часу нічога ў гэтых адносінах не зроблена. А на ф-цы ёсьць рад непарамальнасьцей. У паасобных цэхах (пашывачным) некаторыя рабочыя 2-га разраду заробліваюць ад 150 руб. і абганяюць кваліфікаваных. Фармальна, габінэтна, бяз удзелу мас праводзіцца перагляд норм на заводзе «Ударнік» і радзе іншых.

Вынік растлумачальнай работы

Зразумела, ёсьць і такія прадпрыемствы, якія адносіліся а ўсёй сур'ёзнасьцю да кампаніі перагляду норм. У Палесдруку, напрыклад, пытаньне перагляду норм было абгаворана на бюро партколектыву, фабкоме, на цэхкамітэтах, на партыйных і камсамольскіх сходах, на цэхавых сходах рабочых, на асобных брыгадах. Вялася растлумачальная работа ў часе перапынку. У дапамогу ТНБ прыцягнуты добраахвотнікі з лепшых ударнікаў. Арганізован абор рацыяналізатарскіх прапаноў.

Разгорнута гэта работа і на запалкавай фабрыцы «Вазуль». Прэсаўшчыкі фарнярнага цэху прынялі сустрэчны пляц, да якім з прэсы будуць абслугоўвацца 5 рабочымі, а раней 2 прэсы абслугоўвалі 8 рабочых і для трэцяга таксама патрабавалася 2 рабочых. На заводзе «Дрэвапрацоўшчык» сваячасова зразумелі важнасьць зьніжэньня ўраўнілаўкі і таму ўстаноўлены розныя расцэнкі на адну і тую-ж работу.

Кожны рабочы павінен ведаць прынцыпы перагляду норм

Адным з адмоўных моментаў у правядзеньні рабоце зьяўляецца слабая растлумачальная работа аб прынцыпах і мэтадах перагляду норм. Вядуцца паасобныя няправільныя погляды па некаторых прадпрыемствах (друкарня імя Сталіна), што павышэньне норм выпрацоўкі абавязкова цягне за сабою адпаведнае зьніжэньне заробнай платы.

Гэты погляд у корані няправільны. Перагляд норм павінен унесьці адзарадзьленьне ў існуючую практыку дыфэрэнцыяваньня зарплаты. Мэтады ўстанаўленьня норм выпрацоўкі і зьдзельных расцэнак павінны стварыць сапраўдны стымул зацікаўленасьці да павышэньня сваёй кваліфікацыі, да павышэньня прадукцыйнасьці працы. Яны павінны ўнесьці выразную залежнасьць паміж ростам заробнай платы і выкананьнем прадугледжаных прамфінплянам заданьняў па прадукцыйнасьці працы і інш. паказальнікаў.

Кожны рабочы павінен усьвядоміць значэньне перагляду норм і зьдзельных расцэнак. Неабходна шырока растлумачыць, за кошт якіх элементаў павінна быць дасягнута павышэньне норм.

Зьнішчыць ураўніпаўку ў зарплаце

Новыя нормы павінны зьнішчыць тыя ненармальнасьці, якія наглядаліся да гэтага часу, калі з прычыны няправільнай тарыфікацыі, некваліфікаваны і малакваліфікаваны перагналі у зарплаце кваліфікаванага рабочага, або пачасоўшчык атрымліваў зарплату большую за выпрацоўшчыка тэй-жа кваліфікацыі. Вязумоўна няправільна, калі на гарбарні, напрыклад, рабочы трэцяга разраду вядзе расфарбоўку (фарбаваньне), або 6 руб 87 кап. (сушка) і г. д. У той час, як сярэдняя зарплата па аднэй з кваліфікаваных работ — па струганьні (8-мы разрад) складае 7 руб. 09 кап., або нават 6 руб. 79 кап. (у 2-м хромавым цэху). Такія моманты ўраўнілаўкі вызмоўна павінны быць зьжыты.

Неабходна забясьпечыць больш высокі тэмп росту заработнай платы рабочых вядучых прафэсій. ЦП саюзу і гаспадарчыя аб'яднаньні павінны зараз-жа склясьці зводны сьпіс вядучых прафэсій па галінах прамысловасьці, якія імі аб'яднаюцца.

Пры перагляде норм выпрацоўкі і зьдзельных расцэнак заводзкія арганізацыі павінны падыходзіць не мэханічна, а з найбольш поўным улікам умоў прадпрыемства.

Адхіляючы і выпраўляючы моманты ўраўнілаўкі трэба біць па ўсіляких спробах і ісьці па лініі найменшага супраціўленьня, па лініі зьніжэньня заработнай платы значных груп рабочых.

Пашырэньне зьдзельнай сыстэмы аплаты—асноўная задача

Перагляд норм павінен быць праведзен за кошт ушчыльненьня работага часу, рацыяналізацыі працоўных працэсаў, лепшай расстаноўкі рабочай сілы, правільнага выкарыстаньня кваліфікацыі, ажыцьцяўленьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія прадугледжаны плянамі і ўнесены рабочымі і інш.

Рабочым трэба растлумачыць, што перагляд норм ня мае на ўвазе абмежаваньня зьдзельнага прыработку і мэханічнага яго ўрэзваньня, калі ён зьяўляецца больш-менш высокім. Асноўнай задачай зараз зь

У БОЙ ЗА КОЖНАЕ КІЛЁ ІЛЬНУ

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ТЭКСТЫЛЬНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ СЫРЦОМ

У адказ на адозву рабочых фабрыкі „Дзьвіна“ ўдзесяцярым тэмпы загатовак ільнавалакна, даб'емся поўнага выкананьня плянаў! Удар па апартуністычных разважаньнях аб „чарговасьці“ кампаній, па работніках, няздольных злучаць загатоўкі з падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай вясны

Абяцаньне ня выканана

Прарывы ў Горках не ліквідаваны

11-га студзеня, паводле пастановы ЦК КП(б)Б, Горацкі райком атрымаў вымову за дрэнную работу па ільназагатоўках. З таго часу прайшло больш трох месяцаў. Раён меў поўную магчымасьць падцягнуцца і нагнаць прапушчанае. Гэта ня зроблена. **На 11 красавіка па Горацкім раёне загатоўлена толькі 36,8 проц. пляну па ільнавалакне 50,1 проц. па ільнасемі і 11,3 па пяньцы.**

Кулацкія гаспадаркі абкладзены толькі на 9,7 проц. пляну; цьвёрдыя заданьні атрымалі толькі 5,8 проц. гаспадарак, наперакор дырэктывам вышэйшых органаў, якія выразна гавораць аб абкладаньні цьвёрдымі заданьнямі 5-7 проц. гаспадарак на 12-15 проц. агульнага пляну. З кулакоў спагнана толькі 90 проц. цьвёрдых заданьняў.

У першых лічбах сакавіка, калі ўпаўнаважаны ЦК УсеКП(б) быў у Горацкім раёне, сакратар РК тав. Бутэр у гутарцы з упаўнаважаным прызнаўся, што загатоўкі ў раёне ідуць дрэнна, што ў радзе сельсаветаў ёсьць выпадкі ігнаванага парушэньня клясавай лініі; Горскі сельсавет даў цьвёрдыя заданьні 6,7 проц. гаспадарак па 6 проц. пляну — менш, чым самазабязпечальныя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, Рэкуянскі сельсавет даў цьвёрдых заданьняў 8,1 проц. гаспадарак на 4 проц. агульнага пляну, спагнана толькі 14 проц. Райком абяцаў прыняць усе меры, каб па-бальшавіцку змагацца за лён, каб ліквідаваць прарывы. Абяцаньне ня выкананa. Горацкі раён цягнецца ў хвасьце.

Мы пытаемся ва ўпаўнаважанага ЦК і СНК тав. Райхліна, што зрабіў ён для фарсаваньня загатовак, для ліквідацыі перагібаў у абкладаньні.

Парушальнікаў клясавай лініі—пад суд!

ПУХАВІЧЫ. (Наш кар.). Новасёлкаўскія сельсаветчыкі знайшлі вельмі «лёгкі» метад правядзеньня загатовак. Замест таго, каб пляны загатовак абмяркоўваць на сходах беднякоў і сераднякоў, усьмімаць грамадзкасьць на выкананьне пляну, праводзіць масавую работу, у Новасёлках ідуць па лініі «найменшага супраціўленьня»—загатаўляюць лён і іншыя вілы прыгусовым перадкам. Цьвёрдыя заданьні даводзяцца ня толькі да кулакоў заможнікаў, але да беднякоў і сераднякоў.

У часе штурму ільну старшыня Новасёлкаўскага сельсавету Брагаўка давёў цьвёрдае заданьне больш чым да 60 серадняцкіх гаспадарак. У свой час «Зьвязда» сьпынілізавала аб гэтым парушэньні клясавай лініі, але сельсаветчыкі і вухам не вядуць—засталося сабраць каля 2.000 кг. збожжа, сельсавет зноў парушыў даведзеныя цьвёрдыя заданьні загатовак да бядняцка-серадняцкіх двароў.

Траба, каб [illegible] затрымалася гэтай справай і зрабіла свае вывады.

Р. Дрозд.

Упаўнаважаныя ЦК і СНК адказваюць

на запытаньні „Зьвязды“

У адказ на запытаньне «Зьвязды» аб прычынах нездавальняючага ходу загатовак па **Віцебшчыне** былы ўпаўнаважаны ЦК і СНК па Віцебскім раёне тав. **Зайцаў** дае характарыстыку праробленай работы.

Да яго прыезду ў Віцебскім раёне было загатоўлена 14 проц. пляну па ільнавалакне, зараз—36,3 проц. Раённыя арганізацыі доўгі час зусім не займаліся ільназагатоўкамі. Да 1-га лістапада, напрыклад, было загатоўлена 0,2 проц. у той час, як паводле дырэктыў да 1-га студзеня павінна быць загатоўлена 70 проц. галавога пляну; да лютага цьвёрдыя заданьні былі даны ня больш 1 з пал. проц. гаспадарак і толькі ў лютым яны былі даведзены да 6,5 проц.

Райкаапсаюз ня прымаў ніякіх мер, каб сапраўды своечасова апрацоўвалі лён і здалі дзяржаве. Быў такі выпадак, калі член праўленьня Радзісноўскага насяджэньня РВК выступіў з яўна апартуністычнай тэорыяй, што калгасы ранней вясны лён здаць ня могуць; ён браў падпісі ад старшынь калгасаў, што яны здадуць лён у сакавіку і красавіку.

Райпаўнаважаныя, якія пасылаліся ў сельсаветы на кароткі тэрмін, часта мяняліся і не даводзілі справы да канца.

Палворныя загатоўкі ільну пачалі праводзіцца толькі ў лютым, у той час, калі сялянкі ўжо апрацоўвалі ўлёсь лён. Райкаапсаюз ня прымаў ніякіх мер, каб спагнаць ільнавалакно ў кантрактантаў.

Тав. Зайцаў тлумачыць прычыны яго прыезду ў Менск і невыкананьня дырэктывы вышэйшых органаў: справа ў тым, што раён рэарганізаваўся—10 сельсаветаў перайшлі да іншых раёнаў. Калі раней заданьне складала 420 тон, дык пасьля рэарганізацыі засталося 147 тон. Павялічэньне дазволу масавага сэктару ЦК т. Зайцаў быў вызваляе ад прабываньня ў Віцебску.

Ад рэдакцыі: Т. Зайцаў ня даў ніякага адказу на тое, што зроблена ім для фарсаваньня загатовак.

***

У адказ на запытаньне «Зьвязды» да ўпаўнаважаных ЦК і СНК, што імі зроблена ў раёнах, чаму яны пакінулі раён, ня выканаўшы дырэктыў, упаўнаважаны ЦК і СНК па Бабруйскім раёне т. **Лук'яновіч** паведамляе, што ён пакінуў раён у сувязі з тэлеграмай ЦК КП(б)Б. За час яго прабываньня ў раёне прогант выкананьня пляну ільназагатовак узьнялся з 15 да 30, а на збожжы—да 95 проц.

Пад уладай самацёку

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). Вушацкі раён займае апошняе месца ў ільназагатоўках. Аб гэтым сьведчыць той факт што на 10-га красавіка раённы плян выкананы толькі на 26,2 проц.

Сельсаветы бязьдзейнічаюць, чакаючы самацёку. На працягу 4-5 пяцідневак ад Весьпіцкага і В.-Далецкага сельсаветаў не паступіла ніводнага кілё ільну.

Кубліцкі і Саратынскі сельсаветы доўгі час не маглі «знайсці» кулакоў, каб даць ім цьвёрдыя заданьні. Але калі і знайшлі, дык справа не палепшылася, бо цьвёрдыя заданьні не спаганяюцца. Судова-сьледчыя органы ня прымаюць удзелу ў барацьбе за лён—справы не разглядаюцца па некалькі тыдняў. Далей гэтага становішча нельга цярпець. Патрэбны тэрміновыя меры.

Ліпаўка Я.
Гінзбург Я.

Наша запытаньне да Клічаўскага раёну

Загатоўкі ільнавалакна па Клічаўскім раёне—на пункце замярзаньня.

Калі 25-га сакавіка процант загатоўленага ільнавалакна складаў 23,1 проц., дык на 10-га красавіка ён узьняўся толькі на 1,1 проц.—да 24,2 проц.

Добра прайшлі на раёне загатоўкі ільнасемя—91,3 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што ніякіх «аб'ектыўных» прычын для зрыву заданьняў па ільнавалакне ня было.

Плян кантрактацыі па ільне перавыкананы на 52 проц., затое не закантрактавана ніводнага гектара канапель. Як быццам у раёне забыліся, што-нішка мае вельмі важнае гаспадарчае значэньне.

Лічбы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам выклікаюць некаторае зьдзіўленьне. Цьвёрдыя заданьні даны 3,2 проц. гаспадарак на... 27,2 проц. пляну. Ці няма тут перабаршчаньня, абкладаньня для абкладаньня. Калі ёсьць у раёне такія моцныя гаспадаркі, што іх можна было абкласьці да 27,2 проц. пляну па ільнавалакне і 38,4 проц. па ільнасемі, дык чаму-ж цьвёрдыя заданьні спаганяюцца так дрэнна—па ільнавалакне здана кулакамі 14,6 проц., па ільнасемі—27,1.

Просім раённых работнікаў Клічаўшчыны адказаць, ці няма тут заканчэньня абкладаньнем, чаму спагнаньне цьвёрдых заданьняў ідзе вельмі дрэнна.

Цьвёрдыя заданьні не спаганяюцца

ЕЛЬСК. (Наш кар.). Ільназагатоўкі па Вялікабокаўскім сельсавеце—пад пагрозай зрыву. Плян загатовак ня выкананы і на 20 проц. Даведзеныя да кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні не спаганяюцца. Пануе апартуністычная стаўка на самацёк.

Месячнік штурму зусім не закрануў сельсавет. Мясцовыя адказныя работнікі Броль і Брылёў замест мабілізацыі мас на штурм прарываў, займаючыся палаваньнем на ...варон. Калкрэтныя арыўшчыкі ільназагатовак павінны быць аддаены пад суд.

З. Вішнёвы.

Увага—загатоўкам малака

Кантрактацыя малака і масла ў БССР праходзіць зусім нездавальняюча. У той час, калі калгасны сэктар перавыканаў заданьне па кантрактацыі на 27 проц., аднасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадарні здалі толькі 35 проц. пляну. Ніякіх вестак няма аб тым, як выконваюць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможныя гаспадарні.

Яшчэ горш ідуць загатоўкі малочных прадуктаў. Квартальны плян загатовак па лініі Белмалжывсаюзу выканан усяго толькі на 2,5 проц. пляну.

Мясцовыя арганізацыі не аддаюць увагі кантрактацыі і загатоўкам малочных прадуктаў.

У радзе раёнаў яшчэ не адкрыты пункты на здачы малака, што значна тармозіць загатоўкі.

Зусім слаба праходзіць кантрактацыя і загатоўкі малочных прадуктаў па Клічаўскім, Хойніцкім, Сьмілавіцкім, Смалявіцкім, Веткаўскім, Быхаўскім, Камарынскім раёнах. Праўленьне Белмалжывсаюзу пастанавіла прыцягнуць да адказнасьці за зрыў загатовак і кантрактацыі старшынь Сьмілавіцкага і Смалявіцкага райкаапсаюзаў.

У некаторых раёнах мае месца разбазаўваньне малака. У Копыдаўскім раёне у малочным таварыстве атрымліваюць малако 24 раённых работнікі.

Пастанова ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе раённыя арганізацыі разгарнуць самую рашучую барацьбу за выкананьне пляну загатовак малочных прадуктаў. Гэта пастанова павінна быць выканана ў самы кароткі тэрмін.

2 цэнтнэры за... 15 дзён

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.). Халопенішчыя загатоўчыя арганізацыі зусім забылі пра лён і недавыканалі пляну ільназагатовак НА 60 ПРОЦ. Яны напэўна думаюць, што ў часе разводзьдзя лён сам папляце з вёсак, што ён сам прыдзе на ільнапрадзільныя фабрыкі.

Райкаапсаюз выканаў свой плян на 54,4 проц., спажкаапэрацыя—усяго толькі на 27 проц.

Аб тым, што ў загатоўках ільну пануе поўная апартуністычная бязьдзейнасьць, сведчаць лічбы паступленьня ільнавалакна за апошнія 15 дзён. Райкаапсаюз загатовіў... 2 цэнт., спажкаапэрацыя — 776 кілё. Гэта ў той час, калі ў кожным сельсавеце існуюць ужо сельскія спажывецкія таварыствы, якія б маглі разгарнуць вялікую работу па загатоўках.

Зусім недапушчальна такое становішча; калі ў ЧЫРВОНА-ЛУЦКІМ КАЛГАСЕ, дзе было засеяна 2 гэкт. ільну, лён ляжыць на апрацаваным, а калгас ня турбуецца. У распаўсывецкім саюзе зусім не складаюць зводак. Яны лічаць, што кампанія ільназагатовак ужо скончана, што зараз можна працаваць у парадку... самацёку.

А.

Драпежнікі з бягомльскай каапэрацыі

Ну, як не дапамагчы «свайму» чалавеку? Псаваць сяброўскія адносіны з-за «драбніцы» невыгодна. Сёньня ты яму дапамог, а заўтра ён табе.

Старшыня праўленьня Бягомльскага РСТ Жылко і яго намесьнік Бельскі гэта ўявілі вельмі добра. Яны «дапамагалі» чым маглі радным і знаёмым. Табе бацінкі? Калі ласка, запісачку. Табе калёшы — запісачку. Мукі? Тканінкі? Нітак? Са здавальненьнем!

На гэтыя «запісачкі» былі выпісаны поўнасьцю настольныя каляндары Надзежына і Бельскага, потым яны пусьцілі ў ход упаковачную паперу, а потым і ўсё, што трапіла пад руку. Асабліва стараўся Бельскі. Па яго запісках атрымалі боты работнік РВК Рапапорт, сакратар РСТ Сушко і г. д. Так разбазарылі паміж «сваімі» звыш 50 пар ботаў, прызначаных для «25-тысячнікаў».

Добра, калі на запісцы было ўказана, каму і што адпусьціць. Ведалі тады крамнікі, што па гэтай запісцы атрымлівае інспэктар, па гэтай сакратар, па гэтай — нам. заг. пошты, па гэтай брат..

Большасьць-жа запісак былі зусім бяз прозьвішчаў: «адпусьцеце за наяўны разьлік тое і тое». Бывалі нават і такія запіскі: «Выдайце за наяўны разьлік». А што выдаць — не паказана, і прад'яўнік такой запіскі мог сьмела патрабаваць ад работнікаў прылаўку ўсё, што яму спадабаецца. Некаторыя запіскі загадвалі крамам адпускаць тавары без каапэрацыйных кніжак. Здаралася і так: прыходзіць у праўленьне РСТ кравец-саматужнік з такой запіскай: «Тав. Бельскі адпусьці гэтаму краўцу мануфактуры, ён шые мне гарнітур». Такія «патрэбы» праўленцы ахвотна здавальнялі. Аднойчы была выдана такая запіска: «Выдайце ваты, мыла і ...адэкалёну» (?) Подпіс: Бельскі.

Служачым Вярэзіна-ліпскага вучлеспрамгасу выдавалі таксама на запісках дэфіцытныя тавары бяз кніжак. Нейкі Жылко, пяпайшчык, атрымаў па запісцы паліто і бацінкі.

Мелі месца і такія факты. Настаўніца Карпікава атрымала 6-га лютага па запісцы Бельскага 6 мэтраў тканіны, праз 4 дні яна зьявілася в «візытам» да Надзежына (Бельскі паехаў на раён) і атрымала другую запіску на 7 мэтраў тканіны. Калі-ж выдавалі тканіну па кніжках, Карпікава і тут не «зевала» — зноў атрымала.

Так, направа і налева, пяпайшчыкам і пяпайшчыкам, бяз кніжак, бяз паю адпускаліся па запісках «кіраўнікоў» РСТ розныя дэфіцытныя тавары, вызначаныя для «25-тысячнікаў», сляпы—пайшчыкаў.

Дзівіліся пяпайшчыкі, дзівіліся крамнікі, куды ідуць прамтавары. Толькі маўчалі, баяліся «праўленцаў», не адважыліся выкрыць іх злачынствы. Грамадзкага кантролю ня было, раённая газэта «Калгасны змагар» гэтай справы зусім не заўважыла, усе раённыя арганізацыі маўчалі, маўчала і РСІ.

Частка раённых работнікаў сама была зацікаўлена ў такой «работе» каапэрацыі, частка проста не хацела парушыць добрасусядзкія адносіны.

Да сёньняшняга дня працягваецца работа арыўшчыкаў плянавага забясьпячэньня працоўнага насельніцтва. Да сёньняшняга дня яны яшчэ працуюць у Бягомльскай каапэрацыі. Усё новыя і новыя пішуцца запіскі. Пракуратура павінна зацікавіцца гэтай справай.

Час спыніць разбазарваньне тавараў.

І. Цывес.

Аб тэрмінах адкліканьня спэцыялістаў і студэнтаў з пасеўнай кампаніі

Загад упаўнаважанага СНК БССР па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі

У СУВЯЗІ З ПОЗЬНІМ НАСТУПЛЕНЬНЕМ ВЯСНЫ, ПРАПАНУЮ ЗАГАДЧЫКАМ РАЙЗА, КАЛГАСНА-КААПЭРАЦЫЙНЫМ СЫСТЭМАМ І ГАСПАДАРЧЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ:

ПАКІНУЦЬ НА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ЎСІХ МАБІЛІЗАВАНЫХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОЎ, НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫХ ІНСТЫТУТАЎ І ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ ДА 1 МАЯ.

ТЭРМІН ПРАБЫВАНЬНЯ НА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ СТУДЭНТАЎ С.-Г. ВНУ І ТЭХНІКУМАЎ УСТАНАВІЦЬ 15 МАЯ, СТУДЭНТАЎ-ЖАНОК 3-Х КУРСАЎ С.-Г. АКАДЭМІІ, ЗООІНСТЫТУТУ І ВЭТІНСТЫТУТУ ВЫЗВАЛІЦЬ 1 МАЯ, ЯКІЯ ПАВІННЫ ВЯРНУЦЦА Ў НАВУЧАЛЬНЫЯ УСТАНОВЫ І ПРЫСТУПІЦЬ ДА ТЭАРЫТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ.

УПАЎНАВАЖАНЫ СНК БССР І НАРКАМЗЕМ РАЧЫЦКІ.

У адказ на вылазку клясавага ворага
МАБІЛІЗУЕМ УСЕ СІЛЫ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

Прэзыдыум ЦП саюзу тарфянікаў—аб вылазцы антысэмітаў на заводзе Ізапліт № 2

Прэзыдыум ЦП саюзу рабочых тарфяной і сланцавай прамысловасьці БССР заслухаў інфармацыю аб контр-рэвалюцыйнай вылазцы антысэмітаў на торфзаводзе Ізапліт № 2 («Зьвязда» ад 19 красавіка).

Прэзыдыум кваліфікаваў вылазку антысэмітаў Сьцепанкова, Сасіноўскага і Старавойтава супроць рабочага-ўдарніка Навельскага, як адкрытае контр-рэвалюцыйнае выступленьне клясавага ворага, накіраванае на распальваньне нацыянальнай варожасьці сярод рабочай клясы і на падрыў сацыялістычнага будаўніцтва.

Прэзыдыум пастанавіў прасіць сьледчыя органы найхутчэй расьсьледаваць гэту справу, назначыць спуханьне яе ў показальным парадку на буйнейшым торфзаводзе «Асінторфе», у якасьці грамадзкіх абвінаваўцаў выклікаць прадстаўніка саюзу, а таксама прадстаўніка газэты «Рабочий», якая шэфствуе над тарфяной прамысловасьцю.

Недаючы гэтай справе вялікае палітычнае значэньне, прэзыдыум ЦП саюзу пастанавіў арганізаваць масавыя мітынгі на прадпрыемствах тарфяной прамысловасьці, прысьвечаныя вылазцы абнагледнага клясавага ворага. Увага ўсіх тарфянікаў павінна быць завострана на палітычным зьмесьце гэтай вылазкі. У адказ на выступленьне рабочыя-тарфяністы павінны яшчэ больш мабілізаваць сілы на перавыкананьне прамфінпляну трэцяга рашэючага году пяцігодкі.

Усім саюзным арганізацыям прапанавана паглыбіць інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых мас.

ПРЭЗЫДЫУМ ПАСТАНАВІЎ РАСПУСЬЦІЦЬ ТАРФКОМ ЗАВОДУ. УСЯМУ СКЛАДУ РАСПУШЧАНАГА ТАРФКОМУ ВЫНЕСЕНА СУРОВАЯ ВЫМОВА. АНТЫСЭМІТЫ СТАРАВОЙТАЎ, СЬЦЕПАНКОЎ І САСІНОЎСКІ ВЫКЛЮЧАНЫ З РАДОЎ САЮЗУ.

Адзначана, што былы кіраўнік заводу Ізапліт № 2 — «Новстромтрест» зусім безадказна аднёсься да будаўніцтва гэтага заводу, якое вялося бяз пляну, вытворчай праграмы завод ня мае дагэтуль. «Торфпрадукт», якому перададзены завод, таксама правяў безадказныя адносіны да прадпрыемства, не забясьпечыў яго кіраўніцтвам, ня выпрацаваў канкрэтнай праграмы і пляну.

Прэзыдыум ЦП прызнаў, што завод зьяўляецца аб'ектам шкодніцтва і растранжыраваньня дзяржаўных сродкаў і зьвярнуўся ў НК РСІ з просьбай тэрміновага праверыць ход будаўніцтва заводу і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ:

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз., пак. № 6, — радыё-перадача — «Гісторыя народаў СССР», статыстыка і тэхніка плянаваньня. Ад 19-21 гадз. — індывід. кансульт. па гісторыі партыі.

— **ЦК МОПР'у БССР.** У 19 гадз. — чарговае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР. Пасяджэньне фракцыі ў 18 гадз.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз. — агульны сход інстытуту літаратуры БАН. Даклад т. Гальперыны на тэму: «Задачы міжнародняй пралетарскай літаратуры». Уваход вольны.

— **БАН.** У 19 гадз., у пам. ін-ту філёзофіі БАН адбудзецца прадпраг спрачак па дакладу т. Левіна на тэму: «Матэрыялізм і тэрміны». Уваход вольны.

— **Фіз.-тэхн. нав. т-ва.** У 17 гадз., у пам. фіз. ін-ту (Зямляробскі зав.) — пасяджэньне фіз.-тэхн навук. т-ва.

Усім рэдакцыям насьценгазэт і шматтыражак.

21 красавіка, у 7 гадз. веч., у памяшк. Дому Камасьветы (пакой 19, уваход з вул. Энгельса), адбудзецца **групавая кансультацыя для членаў рэдкалегій насьценгазэт і шматтыражак і рабкораў** па пытаньні **падрыхтоўкі да справаздачна-перазвыбарчай кампаніі рэдкалегій і падселькораў.** Дакладчык — рэдактар газ. «Рабочий» т. Красіна. Просьба зьявіцца тым рабкораў.

Друк—у масы

Перабудаваць работу раённага апарату распаўсюджаньня

Яшчэ ў студзені ва ўсіх раёнах БССР быў створан раённы апарат распаўсюджаньня. У гарадох арганізаваны газбюро, а ў раёнах вылучаны райарганізатары. Здавалася-б, што створаныя раённага апарату павінна было забясьпечыць прасоўваньне друку па ўсіх каналах распаўсюджаньня. Між тым, справа абстаіць інакш. Кантрольныя лічбы першага кварталу, асабліва па беларускіх і нацменаўскіх выданьнях, амаль па ўсіх раёнах ня выкананы. Тыражы асобных газэт у большасьці штомесячна паніжаюцца, або ўвесь час стабільныя. На красавік тыраж газ. «Зьвязда» зьменшыўся на 1.000 экз.; «Калгасьніка Беларусі» — на 2.400 экз.; «Чырвонай зьмены» — на 600 экз.

Тлумачыць гэта можна толькі тым, што раённы апарат распаўсюджаньня—не на вышыні свайго становішча, проста бязьдзейнічае і амаль ніячога ня робіць у адносінах арганізацыі максымальнага прасоўваньня друку ў шырокія масы працоўных.

У Жлобінскім газэтным бюро, напрыклад, працуюць 3 работнікі. Аднак, справа распаўсюджаньня друку там пастаўлена вельмі дрэнна. Пляну работы газ. бюро ня мае. Масава-тыражная работа не праводзіцца. Улік распаўсюджвальнікаў і сувязь з імі не наладжаны. Сувязь в мясцовымі ўстановамі і арганізацыямі, у першую чаргу з райкомам КП(б)Б, адсутнічае. Кантрольныя лічбы для раёну на першы квартал былі дасланы ў ранком толькі да ведама, а на другі — і гэта ня зроблена. Адсюль і вынікі падпіскі. **Усяго па раёне на 11.100 двароў (без калгасаў) выпісваецца каля 7.600 экз. газэт,** прычым добрая палова прыпадае на горад. **Асабліва мала выпісваецца беларускіх і нацменаўскіх выданьняў.** Пры наяўнасьці ў раёне **больш 700 партыйцаў, газэты «Зьвязда» выпісваецца (на сакавік) 237 экз.,** праўда, па красавік гэта лічба крыху павялічылася, але зусім мала; **«Калгасьніка Беларусі» —412 экз.;** «Чырвонай зьмены»—на 600 камсамольцаў — 315 экз.; «Акцябра» — 57 экз.; «Оркі» — 40 экз. Прычыны зразумелыя.

Загадчык Жлобінскага газбюро не адпавядае свайму прызначэньню. Ён штомесячна па дзён 15 траціць толькі на складаньне грашовай справаздачы, 3-4 дні — на складаньне тыражнай ведамасьці, у іншыя дні піша карткі, перакладвае цыркуляры, якіх з аднаго толькі сэктару друку паступіла за месяц 37 экз. і г. д. Прыкамандыраванага да яго супрацоўніка ён не жадае ўводзіць у курс справы, баіцца адкрыць «сакрэт»(?) сваёй работы. **Райарганізатар таксама працуе дрэнна.** Увесь час знаходзіцца ў горадзе, а ў раён не выяжджае нібы з тае прычыны, што ў яго няма валёнак і кажуха. Не пачата работа і ў горадзе, такі вучастак, як чыгунку, дзе «Зьвязда» выпісваецца адзінкамі і наогул газэт мала, райарганізатар нават не наведвае. Што гэта за райарганізатар і якая можа быць работа, калі ён ня ведае, колькі ў раёне двароў аднасобнікаў, калгасаў і ў іх двароў, партыйцаў, камсамольцаў, школ, вучняў і г. д. Праўда, райарганізатар заняты работай, але толькі зусім ня тэй, якую ён павінен выконваць.

Падпіска на друк у Копыскім раёне, пачынаючы са сьнежня, па некаторых выданьнях усё зьніжаецца. Толькі з сакавіка на красавік падпіска на «Зьвязду» зьменшылася на 24 экз.; на «Калгасьнік Беларусі» — 73 экз. Аднак, райарганізатар не зварачае на гэта ніякай увагі.

За 6 месяцаў работы райарганізатар быў толькі ў 4 сельсаветах (у раёне 8 сельсаветаў). Ён ня быў ні разу на Якаўлевіцкай суконнай фабрыцы, дзе на 35 партыйцаў выпісваецца 6 экз. «Зьвязды», на 25 камсамольцаў —2 экз. «Чырвонай зьмены», а ўсяго 65 экз. газэт на 230 рабочых.

Адбываюцца розныя раённыя зьезды, канфэрэнцыі, нарады; арганізатар знаходзячыся тут-жа, на месцы, не скарыстоўвае зьездаў і ня ставіць на іх пытаньня аб друку. Больш таго, калі да яго зварачаюцца з просьбай выпісаць газэту, дык ён адпраўляе (за малым выключэньнем) да тэхнічнага работніка, часамі дадае «гэта не мая справа»(?) у той час, як ён сам нічога ня робіць. Сувязь з раённымі ўстановамі і арганізацыямі адсутнічае. Ня цікавяцца справай распаўсюджаньня друку загадчык паштова-тэлеграфнай канторы і яго намесьнік, яны лічаць, што гэта справа іх не датычыць.

Кантрольныя лічбы першага кварталу па беларускіх і нацменаўскіх выданьнях **Арашынскім раёнам** далёка ня выкананы. Больш таго, з сакавіка на красавік падпіска на «Зьвязду» паніжалася на 125 экз.; на «Калгасьнік Беларусі» — 131 экз. і г. д. **Асабліва дрэнная справа на чыгуначным паштовым аддзяленьні,** якое абслугоўвае чыгуначны вузел (прыважальную частку горагалу) і два сельсаветы. Куды гэта варта, калі, напрыклад, на ўвесь вузел, пры наяўнасьці 430 партыйцаў (партком чыг.) выпісваецца толькі 70 экз. «Зьвязды», 23 экз. газэты «Савецкая Беларусь», па Веравошынскім сельсавеце — 5 экз. «Калгасьніка Беларусі», 7 экз. — «Зьвязды». Работа па распаўсюджаньні друку на гэтым вучастку зусім не праводзіцца, нават прыём самацёчнае падпіскі і той не арганізаваны. **Заг. аддзяленьнем ніякіх мер да ліквідацыі гэтага прарыву ня прымае. Газбюро ў сваю чаргу лічыць, што гэты вучастак (чыгунка) іх не датычыць і таксама ніякае работы не праводзіць.**

Слаба разгорнута масавая работа па падпісцы ў сельсаветах, ня гледзячы на тое, што штат газбюро складаецца з 8 асоб. Напрыклад, па Крапіўскім сельсавеце выпісваецца газ. «Зьвязда» — 3 экз., «Чырвонай зьмены» — 2 экз.; па Кудаўскім сельсавеце «Зьвязды»—5 экз.; «Чырвонай зьмены» — 5 экз., «Калгасьніка Беларусі» — 9 экз. Але, ня гледзячы на такое становішча, райарганізатар рэдка выяжджае ў раён. Інструктар - тыражыст проста нічога ня робіць.

З усяго гэтага відаць, што раённы апарат з пастаўленымі перад ім задачамі па распаўсюджаньні друку спраўляецца дрэнна. Сэктару друку неабходна зараз-жа заняцца наладжаньнем работы раённага апарату, праглядзець склад арганізатараў і работнікаў газбюро, паскорыць падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў, арганізаваць паказальныя раёны па распаўсюджаньні, пачаць выдаваць пматтыражку, праз якую шырока асьвятляць вопыт работы арганізатараў і газбюро.

Больш непасраднага, жывога кіраўніцтва і інструктажу работнікаў раёнаў! Менш цыркулярнічаньні!

П-чык.

Косьця ФЕДАРАЎ

Туберкулёз вырваў з нашых радоў Косьцю Фёдарава

З 16-ці год Косьця пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную армію, змагаючыся ў першых радох як паліт-баец, потым як палітрук на Ўсходнім і Заходнім франтох. Школа Чырвонай арміі, актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне клясава-бальшавіцкі загартавалі тав. Фёдарава. І гэта бальшавіцкае загартаваньне паслужыла повадам да жаданьня таго вялікага давер'я, якім адразу пасьля дэмабілізацыі карыстаўся Косьця ў Віцебскай арганізацыі КП(б)Б, дзе ён выбіраўся сакратаром усіх 3-х гарадзкіх райкомаў Віцебскай гарадзкой арганізацыі.

Фёдарава любіла арганізацыя за бальшавіцкую ўстойлівасьць, удумлівасьць, надзвычайную таварыскую чуласьць і дружнасьць. Такім ён быў у першыя дні выбраньня яго на партыйную работу, такім ведала яго ўся КП(б)Б у самы апошні час.

Немагчыма зараз усё аб Фёдараве сказаць. Вельмі сьвежа памяць аб ім, вельмі знагатранна была работа яго, ня гледзячы на моладасьць. Адно трэба зараз-жа падкрэсьліць. Сьмерць тав. Фёдарава, які меў 29 год, павінна быць для нас вялікай перасьцярогай. Трэба больш берагчы маладыя кадры.

Справу, за якую Фёдараў аддаў усё сваё жыцьцё мы давядзем да канца не шкадуючы сваіх сіл, за гэту справу будзем біцца да апошняй каплі крыві.

Шпэктараў, Грыкевіч, Кавальчук, Бімбат, Васільлеў, Жуковіч, Рыжоў.

Усебеларуская нарада мясцовай прамысловасьці

Не падрыхтаваны да будаўнічага сэзону

Пры ВСНГБ адбылася ўсебеларуская нарада дырэктароў буйных гарадзкіх і раённых камбінатаў мясцовай прамысловасьці.

З інфармацыяй удзельнікаў нарады высьветлілася, што падрыхтоўка мясцовай прамысловасьці да будаўнічага сэзону—у пагражаючым становішчы. Большасьць прадпрыемстваў яшчэ не гатова, вабесьпячэньне рабочай сілай дрэннае, будаўнічых матар'ялаў не хапае.

На гомельскіх прадпрыемствах зусім не разгорнута сацыяборніцтва і ўдарніцтва, нагадзеяцца зьяўлеяк цікучасьць рабоілы. З-за недахвацу матар'ялаў затрымліваецца будаўніцтва новай цагельні.

На будаўніцтва па мясцовай прамысловасьці Бабруйску было запраектавана 2 млн. руб. Цяпер, калі трэба ўжо прыступіць да будаўніцтва, адпусьцілі толькі 400 тыс. руб.

Слупку затрымліваецца з прычыны адсутнасьці тэхнічнага кіраўніцтва, гарнкамбінат мае аднаго тэхніка, але яго зараз забіраюць.

У Магілёўскім раёне яшчэ ў мінулым годзе пачалі будаваць новую цагельню. Экспэрты запэўнівалі, што запас гліны займае плошчу ў 15 гэкт. Хутка будаўніцтва цагельні спынілася, бо выявілася, што гліны там зусім мала, а той запас, які ёсьць, ляжыць гнёздамі на вялікай глыбіні пад зямлёй. Цагельня тэта павінна каштаваць 800 тыс. рублёў. У будаўніцтва ле ўжо ўкладзена 200 тыс. руб. Да гэтага часу капчаткова ня вырашана пытаньне—будаваць яе, ці не. Будаўніцтва гэтай цагельні трэба кваліфікаваць, як шкоднітва. Да гэтага часу шкода ня зроблена, каб выявіць канкрэтных вінаватых і прыцягнуць іх да адказнасьці.

***

Трэба адзначыць, што за рэдкім выключэньнем усе ўдзельнікі нарады выступалі на расійскай мове. На шматлікія звароты старшыні нарады, каб гаварылі па-беларуску, выступаючыя ўчарта гаварылі па-расійску. Асабліва нежаданьне гаварыць па-беларуску праявілі наступныя дэлегаты: **экзаміс менскай гарадзкой плянавай камісіі Озэр, дырэктар гомельскага цагельнага трэсту Сарокін, прадстаўнік Бабруйску Каган і прадстаўнік Белсампрасаюзу Галасоўкер.**

Такія адносіны да беларусізацыі сьведчаць аб інгаравальні дырэктараў партыі па нацыянальні.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр імя І. Гурскі
20 красавіка для інстытуту Нар. гаспадаркі
КАЧАГАРЫ
п'еса ў 4 дзеях.
Пачатак у 8 гадз. веч.

ДОМ КАМАСЬВЕТЫ. Сёньня 20-IV у 7 г. веч. АДБУДЗЕЦЦА
ДАКЛАД
для парт і камсам. актыву на падыву 2 на тэму: „ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ СЫСТЭМА І ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ ЗБРОЕНЫХ СІЛ САЮЗУ ССР“.
Пасьля—мастацкая частка.
Білеты ў гаркоме КП(б)Б і чытальні Дому

„Культура“ Новы фільм КАНТАТА (Ешьці і дзеці) Звыш праг.—хроніка Белдзяржкіно. Пач. сэансаў 7, 9-45 і 10
„Інтэрнацыянал“ Замест фільм Апошняя ночы Звыш праграмы—хроніка № 14 Саюзкіно Пач. 1 с.—6 г. Каса—ад 4 г. 30 м.
„Піалстары“ НАЧНЫ РАМІЗЬНІК драма ў 6 частках. Пачатак 1 с.—6 г.
„Юны Піянэр“ Масьлацкі фільм ДЗЯЧЫНА З ПАЛУСЫ Звыш праг. кіно-хроніка. Пачатак з 1 гадз. дня. Каса—з 1 г.

КІНО „СПАРТАК“ З 20-га красавіка выдатны фільм
Жывы труп
Паводле раману ЛЬВА ТАЛЬСТОГА
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.)—(Каса—з 5 гадз.

ЛІКВІДАЦ